МІР ★ ПРАЦА ★ МАЙ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

№ 35 (1776)
АЎТОРАК, 30 красавіка 1963 года
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У НОВЫ ДЗЕНЬ, У НОВЫ СВЕТ...

Сярод матэрыялаў гэтага нумара газеты — некалькі здымкаў. Здымкі, як здымкі, нічым асабліва не адметныя. Такія ў газетах сустракаюцца часта.

Руплівы сейбіт радуецца веснавой цеплыні глебы.

Схіліліся над макетам будучага жылога мікрараёна архітэктары-праекціроўшчыкі.

Усміхаецца настырнаму фотааб'ектыву дружная брыгада рабочых-будаўнікоў.

Задумаўся над рукапісам вядомы пісьменнік.

Зачараваны красою веснавых краявідаў, расставіў на ўскрайку лесу мальберт мастак...

Розныя, можа, нават далекаватыя адзін ад аднаго па змесце, сюжэты. І ўсё ж ёсць у іх нешта агульнае, што яднае іх у адну тэму, адзін фотарасказ. Напярэдадні Першага мая—свята міжнароднай салідарнасці працоўных, свята міру і працы—гэты маленькі фотанарыс расказвае аб галоўным, што вызначае сёння аблічча нашай краіны — аб усенароднай стваральнай працы.

«Кожны дзень у жыцці нашай Радзімы адзначан натхнёнай працай, творчым гарэннем, нястомнай барацьбой савецкага народа за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXII з'езда партыі, — гаворыцца ў палымяным прывітанні Цэнтральнага Камітэта КПСС удзельнікам нядаўняй Усесаюзнай нарады перадавікоў руху за камуністычную працу. — Усе думкі і імкненні Камуністычнай партыі і савецкага народа накіраваны на пабудову камунізма, які ўсталёўвае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Брацтва і Шчасце ўсіх народаў».

Калі б можна было сёння з вышыні касмічнага карабля ўбачыць чалавечым вокам нязмерны абсяг нашай сацыялістычнай дзяржавы, дык хутчэй за ўсё яна ўявілася б шчасліваму касманаўту прыбранай у чырвань першамайскіх сцягоў гіганцкай будаўнічай пляцоўкай. Бо наша краіна і сапраўды нябачаная ў свеце па маштабе будаўнічая пляцоўка, а народ яе — народ-будаўнік. На сваіх святочных плакатах мы любім маляваць савецкага чалавека ў рабочым камбінезоне. Спяцоўка будаўніка — самае прыгожае і самае характэрнае для нашых бурлівых будняў адзенне. Бо кожны з нас адчувае сябе на рыштаваннях будоўлі, імя якой — камуністычнае грамадства.

Мы будаўнікі камунізма і з гонарам гэта ўсведамляем. Кожны з нас робіць справу, на якую здольны, да якой адчувае прызванне,—узводзіць камяніцы ці піша кнігі, узнімае цаліну ці здабывае вугаль, асвойвае касмічныя маршруты ці шукае багацці, схаваныя ў нетрах зямлі. Але кожны з нас ні на хвіліну не забывае, што працай гэтай наближае камуністычную будучыню свайго народа. І ад гэтага справа, якой аддае ён сваё жыццё, набывае крылы, надае чалавеку натхненне.

Нідзе, ні ў якія часы, ні ў якім грамадстве праца і яе значэнне не стаяла так высока, як у нас. Праца—гэта тое, што робіць чалавека воламтам. Праца — гэта тое, што пераўтварае зямлю. Праца — гэта тое, што рухае гісторыю.

Як радасна ўсведамляць, што савецкая літаратура і мастацтва займаюць на рыштаваннях камунізма пачэснае месца. Пачэснае ў тым сэнсе, што яны па праву могуць назваць сябе актыўнымі ўдзельнікамі, а не староннімі сузіральнікамі гэтай вялікай будоўлі. Савецкія пісьменнікі, савецкія мастакі, кампазітары, майстры сцэны, працаўнікі культуры заўжды дбалі і дбаюць, каб дастойна займаць «месца паэта ў рабочым страі». У кожным перыядзе гісторыі нашай дзяржавы майстры слова, жывапісу і песні ў будні і святы былі поплеч з тымі, хто будуе магутныя электрастанцыі і вырошчвае хлеб, хто стварае складанейшыя станкі і раскрывае таямніцы атаму.

Святы нашы — заўсёды надзвычай прыгожыя і велічныя. Вось і заўтра на вуліцы і плошчы гарадоў і вёсак краіны выйдуць незлічоныя калоны дэманстрантаў. Выйдуць так, як выходзілі год, два, дзесяць, трыццаць гадоў назад; так, як выходзяць яны з таго часу, калі Першае мая ператварылася ў нас са свята пратэсту і падпольных сходак — у свята перамогі марксізма-ленінізма, у свята адзінства рабочых і сялян краіны, якая будуе камунізм, са сваімі братамі па класу ва ўсім свеце.

Так, усе першамайскія святы ў нас падобныя сваім уздымам, сваім радасным веснавым настроем — і ў той жа час кожнае з іх своеасаблівае, непаўторнае, новае. Бо год ад году ўсё большыя нашы перамогі, год ад году прыгажэе і багацее наша жыццё, маладзее, змяняецца, новымі фарбамі расцвітае наша зямля.

Толькі наша? Не не толькі! Вясна чалавецтва ўладарна крочыць па ўсёй планеце. Няхай злуюць, шалеюць сілы, якім гэта не па душы. Няхай яны люта супраціўляюцца вясне і сонцу вечна маладых ідэй ленінізма. Занадта магутнае святло новага, каб хто-небудзь мог яго загасіць.

Цудоўны настрой у савецкіх людзей у пярэдадзень Першага мая. Трошкі запазнілася сёлетняя вясна, нібы схамянулася перад святам і да кумачовага палыхання сцягоў на прасторах нашай Радзімы далучыла доўгачаканае ззянне сонечных праменняў. Гэтыя прамені радаснымі блікамі асвятляюць сёння твары нашай дзетвары, рознакаляровымі вясёлкамі адбіваюцца ў вачах заўтрашніх дэманстрантаў, яшчэ прывабнейшай робяць усмешку нашага дарагога госця Фідэля Кастра.

Цудоўны настрой у савецкіх людзей, бо вясна камунізма ўваходзіць у гісторыю планеты, у яе будучыню, у яе надзеі.

А на зямлі, што стала апорай камунізма, ідзе вялікае стварэнне, вялікае будаўніцтва.

Няма шчасця вышэйшага, чым быць удзельнікам гэтага будаўніцтва!

Няма шчасця вышэйшага, чым быць яго песняром!

Няхай жыве Першае мая — дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, дзень адзінства і брацтва рабочых усіх краін!

Мал. Л. ЗАМАХА.

У НОВЫ ДЗЕНЬ, У НОВЫ СВЕТ...

Ідзе чалавек па зямлі, і ўслед за ім, як барозны вось за гэтым трактарам, застаецца след. Па зямлі ідзе чалавек-стваральнік...

Наш сённяшні святочны фотанарыс мы пачынаем з самых будзённых і, дарэчы, з самых надзённых спраў. Надышла вясна, завітаў да нас май, месяц любімага, самага светлага нашага свята. Месяц квецені садоў, месяц — араты і сейбіт.

Зямля... Яе веснавы водар добра ведае чалавек, якога бачыце вы на здымку. Кожны год вось так выязджае ранняй вясной малады трактарыст Яўген Сцепаненка з сельгасарцелі «Расія», што на Магілёўшчыне, і кожны раз вось гэтак бярэ ў рукі жменьку зямлі. Вырасце тут збажына, ці можа што іншае, зменіць зямля свой убор, іншым стане яе водар, бо так пажадаў чалавек! Чалавек-стваральнік. Чалавек-араты.

З першай баразной цябе, Яўген Сцепаненка! З Маем!

НАШ ДОМ—ТВОЙ ДОМ, ФІДЭЛЬ!

Мой таварыш, якому пашчасціла пабываць на Кубе, расказваў, што бачыў такія надпісы і на хацінах, што засталіся сённяшняй рэвалюцыйнай Кубе ў спадчыну ад часоў панавання гора-дыктатара, халуя некаранаваных амерыканскіх каралёў Батысты, і на раскошных асабняках, адабраных Фідэлем і яго юнымі барадачамі ў колішніх гаспадароў краіны і аддадзеных яе сапраўднаму гаспадару — народу.

З сэрцам, поўным любві да свайго правадыра, са шчырым пачуццём удзячнасці за ўсё невымернае, што зрабіў ён для Кубы і для кожнага кубінца, вялізнымі літарамі на сценах дамоў пісаліся словы:

— Гэта твой дом, Фідэль!..

Сёння чорнабароды гігант, імя і харошая ўсмешка якога вядомы кожнаму чалавеку на зямлі і ўжо ж, безумоўна, кожнаму, ад малога да старога, нашаму суайчынніку — госць Краіны Саветаў, наш з табой госць, таварыш!

Сёння мы па-сяброўску, па-брацку, яго абдымаем і паўтараем уголас і ў думках словы, якімі яму выказваюць сваю любоў землякі:

— Наш дом — твой дом, Фідэль!

Ідучы праз парк, я бачыў раніцай, як хлопчыкі з дзіцячага сада, пачынаючы нейкую гульню, ваяўніча вырашалі пытанне, хто з іх—Гагарын, а хто — Фідэль Кастра. І я падумаў аб тым, які ж аўтарытэт і папулярнасць трэба заваяваць, каб дзеці на другой палове планеты спрачаліся за права называцца ў гульні тваім імем. І яшчэ падумаў, што імёны гэтыя — Гагарын і Фідэль Кастра — бадай, у нейкай ступені, з'яўляюцца ўвасабленнем нашага выдатнага гераічнага часу.

Заўтра правадыр брацкага кубінскага народа, першы сакратар Нацыянальнага кіраўніцтва Адзінай партыі сацыялістычнай рэвалюцыі, прэм'ер-міністр рэвалюцыйнага ўрада Рэспублікі Куба Фідэль Кастра Рус — неяк дзіўнавата, хоць і прыемна, вымаўляць гэты ўрачысты тытул чалавека, якога ў думках называеш коратка і проста, нібы брата, Фідэль, — будзе прысутнічаць на першамайскім парадзе і дэманстрацыі ў Маскве.

Мы вельмі рады вітаць на Краснай плошчы ганаровага госця, чыё аблічча і характар гэтак добра адпавядаюць абліччу і характару нашага Першамая і наогул нашым пачуццям у дні гэтага свята вясны, маладосці, братэрства. Малады, прыгожы, палымяны Фідэль Кастра — сам для ўсяго чалавецтва сімвал вясны, маладосці, рэвалюцыі!

Чацвёрты дзень Фідэль Кастра — на савецкай зямлі. Учора яго сустрэла сталіца, сэрца нашай Радзімы — Масква. Уся наша любоў да легендарнага вострава Свабоды і яго мужнага народа вылілася ў цеплыню і ўсхваляванасць гэтай сустрэчы. Мы ганарымся табой, Куба! Мы ўзнімаем у знак рэвалюцыйнага братэрства сціснуты кулак, калі чуем, як грыміць над светам твой грозны і справядлівы вокліч: «Радзіма або смерць! Мы пераможам!» Нашы ворагі ведаюць, Куба, што значыць сціснуты ў гневе кулак міжнароднай салідарнасці працоўных!

Я думаю аб нашай дружбе і салідарнасці, Куба, і ўспамінаю свайго даўняга, яшчэ школьнага прыяцеля, які вучыць цяпер у Гаване тваіх юнакоў і дзяўчат рускай мове — мове, на якой гаварыў Ленін. Я думаю аб нашай дружбе і салідарнасці, Куба, і сардэчна вітаю тваіх пасланцоў — студэнтаў мінскіх інстытутаў. Мінуць гады, і яны павязуць да сябе на радзіму не толькі веды і дыпломы, атрыманыя ў горадзе, які здаецца мне найлепшым на свеце, але і песні маёй зямлі, але і нашу да іх, тваіх сыноў, сардэчнасць.

Але я ўспамінаю і іншае, калі думаю аб гэтай дружбе і салідарнасці, Куба. Я ўспамінаю твары людзей, разам з якімі слухаў на вуліцах Мінска апошнія паведамленні ў дні карыбскага крызісу. Суровыя і рашучыя твары. Я помню, што ў часы вайны такія твары былі ў людзей перад тым, як яны ішлі ў ваенкаматы. Ты ведаеш, Куба, што гэта былі за людзі і на што яны аказаліся здольныя!

...Мой горад — у першамайскай чырвані. У пакой, дзе я пішу гэтыя радкі, урываюцца мелодыі духавога аркестра — на Цэнтральнай плошчы ідзе рэпетыцыя. Чуеш, Фідэль, што іграе аркестр на прасторнейшай з плошчаў Мінска? Ён іграе «Марш 26-га ліпеня», марш кубінскай рэвалюцыі, марш, пры якім святлеюць твары тваіх легендарных «барбудос» і які выклікае ззянне вачэй у майго чатырохгадовага сына.

Твой прыезд у нашу краіну — вялікае свята для савецкіх людзей, Фідэль. Наш дом — твой дом, нашы сэрцы — твае сэрцы!

Уладзімір МЕХАЎ.

Яўген КРУПЕНЬКА

Таварыш Кастра ў Маскве

Самалёт адлятае з Мурманска,
На Маскву
яго курс цяпер.
Легендарны кубінскі Мурамец —
У абдымках СССР.
З сэрца ў сэрца — ток хвалявання,
Скаланаецца
аэрадром:
— Віва, Куба!—
словы яднання,
Гучных воплескаў весні гром.
А на сонцы—пуховыя коцікі
Так прыгрэліся на вярбе.
... Самалёт
лёгка-лёгка коціцца,
На Маскву свой разгон бярэ.
Як прыгожа зямля Расіі!
З неба вокам яе акінь:
І азёры сінія-сінія,
Нібы вочы рускіх жанчын.
На палетках, як сцяг зялёны,
Маладая кусціцца рунь.
Выйшлі трактары на загоны —
Гулкай працай будзіць зару.
Як зямля цеплынёю дыхае —
Нібы сонечны каравай!
А Масква—у сцягах над дахамі —
Маладая, як Першамай.
Легендарны кубінскі Мурамец,
Нашы сэрцы і думы з табой,
Родны брат нам па духу і мужнасці
Барадаты народны герой.
Смела плечы свае выпроствае,
Быццам зброю трымае ў руках,
Каб лунаў над свабодным востравам,
З пяцікутнаю зоркаю сцяг.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

ДА ЛЕНІНА

Такое бывае не часта.
Вось ён —
вялікі міг!
Міг — нібы светлы міф!—
Ідзе да Леніна Кастра.
Плячысты,
чорнабароды,
З той мяцежнай пароды,
Што жыве недарма,
Што ўзнімае народы,
Людзей вырывае з ярма...
Цішэй,
Красная плошча!
Ты бачыла многа падзей.
Такога ж не было яшчэ,—
Да Леніна Кастра ідзе.
Хай змоўкнуць на момант аркестры!
Пад полымем кумача
Герой С'ера-Маэстры
Ідзе да Ільіча.
Ідзе пакланіцца
нізка,
Ідзе,
каб далажыць:
«Таварыш Ленін!
Кубінская
Рэвалюцыя будзе жыць!»

У НОВЫ ДЗЕНЬ, У НОВЫ СВЕТ...

У панядзелак, выйшаўшы з аўтобуса, людзі яшчэ здалёк заўважылі перамены на будоўлі Гродзенскага азотнатукавага завода. Ля корпуса азотнай кіслаты на высачэзных металічных канструкцыях палымнелі на ветры два чырвоныя сцягі.

У суботу, калі ішлі са змены, ні сцягоў, ні саміх канструкцый не было.

Так, у суботу партальны пад'ёмнік ляжаў на зямлі. Брыгада мантажнікаў Леаніда Пятрушкіна многа дзён працавала, каб сабраць яго, падрыхтаваць да пад'ёму.

І вось наступіў дзень пад'ёму. Гэта была нядзеля. Выхадны дзень для ўсіх.

Што такое партал? Уявіце два добра завостраныя алоўкі. Яны ляжаць паралельна адзін аднаму, каб адлегласць паміж імі не парушылася, іх злучылі перамычкамі. А цяпер паспрабуйце паставіць абодва алоўкі вастрыём уніз, каб яны стаялі і не падалі. Няма чаго і спрабаваць, не ўдасца...

Партал — тыя ж два алоўкі. Розніца толькі ў тым, што тут «алоўкі» — гэта металаканструкцыі вагой да 40 тон і вышынёй 53,5 метра. А трэба, каб партал не толькі надзейна стаяў на двух сваіх вастрыях, але і мог падымаць грузы вагою ў дзесяткі і дзесяткі тон.

... Пушчана ў рух сістэма лябёдак. На сваім КП, які відзён ад усіх лябёдак, стаіць Леанід Пятрушкін. Пачынаюць працаваць лябёдкі, партал паволі падымаецца. Раптам брыгадзір рэзка махнуў рукамі — і адразу стала ціха. Лябёдкі выключаны. Значыць, нешта не так. Грузнучы ў вясенняй гразі, брыгадзір бяжыць да рабочых, якія завіхаюцца ля партала.

На значнай адлегласці збоку стаіць група інжынераў — кіраўнікоў мантажнага ўпраўлення. У іх размове раз-пораз чуецца: «А вось у Ангарску было так...», «У нас, у Шчокіна...», «А ў Новамаскоўску зрабілі...»

Размовы гэтыя, як можна было зразумець, вядуцца для таго, каб прыглушыць хваляванне. Партал — першая сур'ёзная справа калектыву мантажнікаў на гэтай будоўлі.

— Узнялі на 30 градусаў... на 37... на 45... Ого, ужо 70 градусаў!.. — адзначалі ў групе інжынераў.

Нехта з іх гаворыць:

— Левая ванта нацягнула занадта туга.

— Не, занадта слаба.

Пятрушкіну пра гэта было сказана так:

— Лёня, правер левую ванту.

Інжынеры ведаюць: не трэба стаяць над душой. Асабліва пры такой адказнай справе. Залішняя апека можа толькі пашкодзіць. На самой справе: некаторыя людзі, стоячы за спіной шахматыста, наіўна мяркуюць, нібыта іх падказкі памогуць выйграць. Уласна кажучы, і выхадны дзень выбран быў для пад'ёму партала, каб не было за спіной «балельшчыкаў»...

Пятрушкін адказвае:

— Толькі што глядзеў. Добра!

І зноў:

— Падрыхтаваліся! — Рэзкі ўзмах рукой. — Уключай!

Лябёдкі ўраз заляскалі, партал усё больш набіраў вышыню. Калі ён стаў перпендыкулярна да зямлі, яго замацавалі. А потым Віктар Страмкоўскі і Міхаіл Закатунін залезлі на самы верх і прымацавалі там два сцягі.

Лунаюць, палымнеюць на ветры чырвоныя палотнішчы, палотнішчы перамогі.

Толькі цяпер зірнулі на гадзіннік: 19. Адзінаццаць гадзін бесперапынна працавалі. А стомленасці ніхто не адчувае, толькі радасць...

Трапечуць сцягі, а ў адказ ім іскрацца вочы, тахкаюць усхваляваныя сэрцы...

А перад самым Першамаем брыгада Пятрушкіна пры дапамозе партала ўзняла і паставіла на фундамент абсарбцыйную калону — вялізны тэхналагічны апарат для вырабу слабай азотнай кіслаты. Вельмі падобная гэтая калона на касмічную ракету. Уся серабрыста-белая, скіраваная ўверх, вышынёй з пятнаццаціпавярховы дом.

На чарзе для пад'ёму другія калоны-ракеты. Выстраіцца іх тут цэлая батарэя...

Заўтра мантажная брыгада Леаніда Пятрушкіна пойдзе ў калоне дэманстрантаў. Вось гэтыя хлопцы будуць несці чырвоныя сцягі. І нібы будуць пераклікацца гэтыя сцягі з тымі, якія бачыце вы на здымку, што палымнеюць над заводам.

ЗА ГУМАНІЗМ, ЗА МІР І ДРУЖБУ!

ДА ПРАВЯДЗЕННЯ У МАСКВЕ МІЖНАРОДНАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ

Крыху больш за два месяцы засталося да таго моманту, калі Масква зноў ператворыцца ў сталіцу сусветнага кінамастацтва. Тут адбудзецца Трэці Міжнародны кінафестываль. Гэтыя фестывалі сталі ўжо традыцыйныя і заслужылі сабе вядомасць як аўтарытэтныя і прадстаўнічыя агляды дасягненняў кінематаграфіі народаў многіх краін свету.

Нагадаем некалькі фактаў. У першым фестывалі (1959 год) прыняло ўдзел 37 краін, апроч таго 7 краін былі прадстаўлены асобнымі фірмамі. Было паказана 134 фільмы — мастацкія і дакументальныя, навукова-папулярныя і мультыплікацыйныя. Другі фестываль (1961 год) прыцягнуў ужо 44 краіны і 3 міжнародныя арганізацыі — ААН, ЮНЕСКО і Дзіцячы фонд ААН. Асобнымі фірмамі або дэлегацыямі былі прадстаўлены 11 краін. На конкурсе і па-за конкурсам была прагледжана 251 карціна.

Будучы фестываль таксама, як і папярэднія, будзе праходзіць пад дэвізам «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі». Яго мэта — выяўленне і заахвочванне лепшых твораў мастацтва кіно, умацаванне ўзаемаразумення і супрацоўніцтва паміж дзеячамі кінематаграфіі ўсіх краін у імя развіцця прагрэсіўных традыцый у творчасці мастакоў кіно, у імя ўмацавання міру і дружбы паміж народамі, якія насяляюць нашу планету.

Запрашэнні прыняць удзел у фестывалі разасланы 115 краінам свету. Многія паведамілі ўжо аб сваёй згодзе. Ёсць падставы меркаваць, што на маскоўскім кінаэкране на аснове поўнага раўнапраўя будзе шырока прадстаўлена кінематаграфія ўсіх кантынентаў зямнога шара. Побач са старэйшымі кінадзяржавамі свету на маскоўскім форуме кіно паўнапраўна зойму́ць сваё месца пасланцы маладых незалежных дзяржаў Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, якія толькі ствараюць сваю нацыянальную кінематаграфію.

Пятнаццаць аўтарытэтных дзеячоў кінамастацтва розных краін увойдуць у склад журы, якое будзе ацэньваць прадстаўленыя на конкурс поўнаметражныя мастацкія фільмы. Ужо можна назваць імёны буйных кінадзеячоў, якія далі згоду ўвайсці ў склад міжнароднага журы. Гэта — рэжысёры Рыгор Чухрай (СССР) і Стэнлі Крамер (ЗША), Ян Рыбкоўскі (Польша) і Кіехіка Усіхара (Японія), Янаш Хершка (Венгрыя) і Душан Вуковіч (Югаславія) і іншыя.

У дні фестывалю, які прадоўжыцца з 7 па 21 ліпеня, побач з праглядамі карцін, адбудзецца свабодная дыскусія на тэму «Кіно ў барацьбе за прагрэс». Удзельнікам фестывалю даецца магчымасць пазнаёміцца з новымі савецкімі фільмамі, наведаць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, калгасы, зрабіць экскурсіі па савецкай сталіцы і яе ваколіцах.

Фестывальныя прагляды будуць праходзіць у адной з буйнейшых і камфартабельных залаў Масквы — Крамлёўскім Палацы з'ездаў, у якой змяшчаецца да шасці тысяч гледачоў. Так што сустрэца з фільмамі, створанымі ў розных кутках зямлі, атрымае магчымасць самае шырокае кола аматараў і прыхільнікаў кінамастацтва.

...Гасцінная Масква ўжо жыве святам сусветнага кінамастацтва, якое набліжаецца. Выробляюцца арыгінальныя фестывальныя значкі і эмблемы. Мастакі абдумваюць, як лепш упрыгожыць вуліцы горада ў дні фестывалю. Шматлікіх гасцей савецкай сталіцы прыме ўжо вядомая кінаработнікам іншых краін па мінулых фестывалях гасцініца «Масква»...

На пытанне карэспандэнтаў, што ён думае аб будучым фестывалі, вядомы савецкі рэжысёр, лаўрэат Ленінскай прэміі Рыгор Чухрай сказаў:

— Зноў савецкія кінематаграфісты сустрэнуцца са сваімі калегамі — лепшымі кінематаграфістамі розных краін свету. Мы чакаем гэтай сустрэчы. Мы не сумняваемся, што фестываль сёлета будзе цікавы, што ён паможа не толькі абмену фільмамі, але і абмену думкамі паміж савецкімі і зарубежнымі кінематаграфістамі, што фестываль будзе спаборніцтвам высокага мастацтва, высокага кінематаграфічнага майстэрства, пастаўленага на службу чалавеку.

У Маскве адбылася першая прэс-канферэнцыя для савецкіх і зарубежных карэспандэнтаў, скліканая Арганізацыйным камітэтам Трэцяга Міжнароднага кінафестывалю. Генеральны дырэктар фестывалю Уладзімір Баскакаў у сваёй заяве для друку сказаў:

— Мы ўпэўнены, што фестываль пройдзе, як вялікае і радаснае свята ў спалучэнні са штодзённай важнай і плённай працай, што ён унясе каштоўны ўклад у вырашэнне высакародных задач кінамастацтва, як магутнага сродку барацьбы за мір, да якога імкнуцца усе людзі зямлі.

АДН.

У НОВЫ ДЗЕНЬ, У НОВЫ СВЕТ...

...Над рукапісам схіліўся пісьменнік, рэдактар часопіса «Маладосць» Пімен Емяльянавіч Панчанка. Што нясуць людзям радкі яго рукапісу? Можа, расказваюць яны сучаснікам і нашчадкам пра трактарыста Яўгена Сцепаненку ці пра маладых рабочых з азотнатукавага? А, можа, пра тое, як сярод лясоў і палёў вырасталі нашы Салігорскі і Светлагорскі, Нафтабуды і Белазёрскі? Як з думай «пра новы дзень, пра новы свет» жыў, марыў, кахаў чалавек шасцідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя.

А калі гэта новыя вершы паэта, дык, напэўна, будуць у іх радкі і пра ясныя зоры і пацалункі, пра рамантыкаў далёкіх і блізкіх дарог. Бо кожная новая вясна — гэта абавязкова вясна чыйго-небудзь новага кахання. Кожны новы май нараджае рамантыкаў, тых, чые сляды застануцца не толькі на зямлі, але і «на пыльных сцяжынках далёкіх планет»...

Антон БЯЛЕВІЧ

ПЕРШАМАЮ

Пісаць бы агнём навальніцы
Пра першы яго кволы след,
Як змог нарадзіцца, прабіцца
З пакутных астрогаў на свет.

Пісаць бы маланкай агністай
Пра лёс яго ў змрочнай глушы,
Як дбала яго камуністы
Расцілі, хавалі ў душы.

Пісаць бы гарачай крывёю
Пра цяжкую долю яго,
Як тою далёкай парою
Праз буры,
Віхуры,
Агонь
Пракладваў сабе ён дарогу,
Цару абвясціўшы вайну,
І нёс на сцягах перамогу
Дваццатаму веку свайму.

Пад сонца яго людзі выйшлі,
Пад родны сабраліся сцяг.
А май сыпануў цветам вішні
І цветам чаромхі на шлях.

На луг сыпануў шчодра кветкі,
А птушак — на сад, у бары.
Ідзе, засявае палеткі
Ад яснай зары да зары.

Ідзе, высявае па краю
Уцехі і радасці ён.
І я кажу роднаму маю:
— Зямны табе нізкі паклон!

Алеся ДАВІДОЎСКАЯ

НАСУСТРАЧ ЛЕТУ

Вясна ў зялёным сарафане,
Што ў шлях збіралася даўно,
Рукой блакітнавокай Тані
Пастукала ў маё акно.

Я выбягу на воклiч звонкі
У сполах ранішняй імжы,
Дзе рассыпаюць спеў свой тонкі,
Як цымбалісты, капяжы.

Растане ціха сум дзявочы,
Нібы апошні след зімы.
Рука ў руцэ і вочы ў вочы,
Насустрач лету пойдзем мы.

НОВАЯ КНІГАРНЯ

Размова аб арганізацыі гандлю кнігамі ў раёне завода «Гомсельмаш» вялася ўжо даўно. І вось нарэшце ў новым доме, нядаўна пабудаваным побач з заводскім Палацам культуры, адкрылася кнігарня.

У ёй — вялікі выбар палітычнай, мастацкай, дзіцячай і вучэбна-метадычнай літаратуры. Многія кнігалюбы набылі для сваіх хатніх бібліятэчак новыя кнігі. Попыт на літаратуру расце з кожным днём.

Добры падарунак атрымалі намбайнабудаўнікі да першамайскага свята.

В. СЯМЕНАЎ.

ПОПЛЕЧ!

Генадзь БУРАЎКІН

Я люблю глядзець, як у святы трапяткім, радасным полымем запаўняюць вуліцы сцягі, як над калонамі дэманстрантаў горда і велічна плывуць чырвоныя палотнішчы, як упэўнена і цвёрда ступаюць сцяганосцы.

Ідуць старыя камуністы, ідуць ветэраны працы і ідуць мае равеснікі — маладыя, вясёлыя, дужыя. Я любуюся імі, іх дакладным поступам, іх адкрытымі тварамі.

Я ўглядаюся ў старэйшых, у тых, што ідуць наперадзе. Гэта нашы бацькі, гэта тыя, хто запаліў над светам полымя Кастрычніка, хто выпеставаў слаўную нашу дзяржаву. Я не ведаю іх прозвішчаў, іх імёнаў. Але я ведаю, што гэта харошыя людзі — кадравыя рабочыя, ударнікі камуністычнай працы, камуністы. Я гляджу на ўзнятыя імі сцягі і думаю пра тачанкі грамадзянскай вайны, пра кельмы Дняпрагэса і Магнітагорска, пра партызанскія аўтаматы.

Сцяганосцы. Людзі, якія ідуць наперадзе. Людзі, на поступ якіх раўняюцца шарэнгі ў баі і ў паходзе... Здаралася, што рады чырвоных сцяганосцаў радзелі. Бо ў іх стралялі з абрэзаў, у іх кідалі гранаты. Але сцяг ніколі не падаў. Падалі сцяганосцы, перадаючы дрэўка таварышу.

Увесь наш народ назвала чалавецтва сцяганосцам шчасця і волі, міру і працы. Народ-сцяганосец... Гэта вельмі ганарова і вельмі адказна. Сцяганосец — наперадзе. На сцяганосца глядзяць усе.

У будні і святы кожны з нас больш за ўсё думае пра тое, што яму — самае блізкае. Я думаю аб літаратуры.

Сёлетняя вясна была для літаратараў вясной вялікага роздуму, была вясной вялікай праверкі ідэйнай нашай зброі. Строгасць і добразычлівасць, патрабавальнасць і прынцыповасць, з якімі кіраўнікі партыі і ўрада гаварылі на сустрэчах на Ленінскіх гарах і ў Крамлі з работнікамі мастацтва, выклікаюць пачуццё шчырай удзячнасці партыі і народу, выклікаюць патрэбу яшчэ раз асэнсаваць сваю творчасць.

Брыдка, што ў нашых радах знайшліся тэарэтыкі, якія падзялілі наша грамадства на «бацькоў» і «дзяцей», далёкіх адно ад другога. Брыдка, што знайшліся «дзёгцямазы», якія аблівалі грязёю пісьменнікаў, што жылі і працавалі ў 30—40 гады, і ўздымалі на п'едэстал «зорных хлапчукоў» — бяздумную і безадказную фронду. Ім хацелася вырваць сцяг з дужых і мужных рук бацькоў. Сёння ўжо крыху нават смешна ўспамінаць недалёкія часы, калі не зусім даўчапныя крытыкі агітавалі за «Зоркавыя білеты» і са смакам абнюхвалі шалупіння замежных апельсінаў, калі за смеласць спрабавалі выдаць вершыкі з трыма падтэкстамі і без ніводнага яснага тэксту...

Пакаленне сыноў, пакаленне тых, каму сёння 20—25... Няўжо яно такое, як паказваюць яго В. Аксёнаў і Я. Еўтушэнка? Няўжо гэта яно так лёгка адкідае прынцыпы бацькоў?.. Не! Пакаленне наша — гэта Юрый Гагарын і Герман Цітоў, гэта славуты шахцёр Кузьма Севярынаў і рупны хлебароб Люба Малдаван, гэта пакаленне салігорцаў і нафтабудаўцаў, пакаленне сумленных і чыстых людзей. Мы ведаем, што і ў гады Паўкі Карчагіна былі дваццацігадовыя паслугачы Махно і Маруські, нэпманчыкі і спекулянты. Але не іх мы помнім. Вецер часу здзьмуў іх, як пену з магутных хваль чыстай ракі. І пакаленне 20—30 гадоў засталося для нас пакаленнем Карчагіна, пакаленнем Магніткі і Камсамольска... Мы не дазволім разбэшчаным цынікам і нахабным нігілістам адрэкамендоўвацца прадстаўнікамі нашай маладосці! Мы — сыны сцяганосцаў і самі сцяганосцы. Некрыклівая, спакойная, працавітая маладосць наша стаіць поплеч з бацькамі, плячо да пляча, локаць да локця. Гэта маладосць, у якой ёсць ідэалы, якая верыць у чыстае каханне і ў любімую працу, у праўду бацькоў і старэйшых братоў.

Я помню, як на Нафтабудзе аднойчы разгаварыўся з маладымі хлопцамі пра «Зорны білет» В. Аксёнава. На маю гарачнасць у адносінах да гэтага твора нафтабудаўцы неяк вельмі проста адказалі: «Дзівак... Навошта гарачыцца... гэта ж глупства. Дзіўна, вядома, што такое друкуюць, але ж усур'ёз да гэтага нельга ставіцца. Усё ясна! Піжон піша пра піжонаў. Чытаць гэты раман проста смешна...» Калі б вось так адразу Аксёнаву сказалі і крытыкі, відаць, не было б гнілых «Апельсінаў з Марока»...

Ёсць у кожнага чалавека святое, што жыве з ім да смерці. І калі ў яго збіраюцца адабраць гэтае святое, ён уступае ў бой. Так, мы абяўляем бой Еўтушэнку пасля яго «аўтабіяграфіі», бо ён спрабуе плюнуць на самае святое — на народ, які яго корміць, на дзяржаву, якая яго выдае 100-тысячным тыражом, на сцяганосцаў, што вялі за сабой байцоў, якія засланілі яго ад невуцтва, голаду і смерці. Можна выкінуць на сметнік старую модную кепку, але нельга выкідаць будзёнаўку, у якой бацька імчаў у радах Першай Конніай. Можна выкінуць на сметнік фатаграфію ўжо не моднай кіназоркі, але нельга выкінуць фатаграфію старэйшага брата, якога расстралялі фашысты...

Пакаленні ідуць поплеч — сцяганосцы і іх сыны, таксама сцяганосцы. Вось крочыць побач з пасівелым кадравым рабочым, камуністам зусім юны камсамолец-падручны. Вось ідзе разам з сівым хлебаробам малады аграном. На дрэўку нашага чырвонага сцяга — побач загарэлыя дужыя далоні бацькоў і дзяцей.

Ёсць такія людзі ў Белазёрску

Калі расказваць пра людзей, то хіба можна ўстрымацца і не пачаць з таго, што зрабілі рукі гэтых людзей, чым і як упрыгожылі і пераўтварылі зямлю?

Давайце вось гэтак жа, як зрабіў наш малады мастак Мікола Рыжыкаў, спынімся крокаў за трыста ад галоўнага корпуса будоўлі і прысядзем дзе-небудзь на трубе газаправода. Акінем вачыма панараму Бярозаўскай ДРЭС. На пярэднім плане — галоўны корпус. Яшчэ здалёк ён прывітае вас феерверкам электразваркі, а потым раскрые магутнае і разам з тым тонкае, складанае перапляценне сваіх машынных збудаванняў і канструкцый. Вы не адразу зможаце адарваць свой позірк ад гэтага малюнка, і тое, што ў гэты момант узнікне ў вашай душы, можна без перабольшання назваць гімнам інжынернаму генію чалавека. Асабліва ж, калі вы з'яўляецеся прадстаўніком адной з гуманітарных прафесій, калі яшчэ са школьных гадоў не вельмі сябравалі з матэматыкай і фізікай, то ўжо тут вам і не перастаць здзіўляцца і захапляцца. Дык вось і яшчэ, аказваецца, на якія цуды здольныя рукі і мозг чалавечы...

Але варта толькі пераключыць позірк на абодва бакі небасхілу, як адкрыюцца прасторы больш даступныя «гуманітарнаму ўяўленню». Тонкім карункавым узорам абвілі будоўлю лініі электраперадач. Глядзіце, глядзіце далей... Вось яны перайшлі на палеткі, вось падключыліся да добрых волатаў — жалезных слупоў, — і тыя, размашыста раскінуўшы «рукі», пакрочылі направа, налева. І пайшоў разам з імі ток... Пайшоў у Мінск, Брэст, да навакольных гарадоў і вёсак. У цэхі заводаў, у аўдыторыі інстытутаў, у кватэры людзей пайшло жыццё, святло, энергія.

Людзі з Бярозы, мы ведаем цану гэтага падарунка. І няхай заўсёды кожнае, яшчэ адно знаёмства з вамі, пачынаецца з простага чалавечага слова: дзякуй! Дзякуй за тое, што і ў мароз, і ў спякоту пракладвалі вы лінію газаправода. Што ўгрызаліся механізмамі, лапатамі і ламамі ў зямлю. Што каналі катлаваны, закладвалі падмуркі, манціравалі турбіны. І за тое дзякуй, што абжывалі вы гэты светлы гарадок Белазёрск, хаця ведалі, што жыць тут давядзецца іншым. А вам хутка зноў збірацца ў дарогу, зноў пачынаць усё з самага пачатку, ад першага выкінутага з катлавана камяка зямлі... Ну што ж, няхай будзе так... Затое кожная новая панарама будоўлі мае сваё аблічча, якое перадаў ёй чалавек-стваральнік.

...Калі весці расказ пра людзей з Бярозы, то як не аддаць тут з пашанай першае месца Івану Аляксандравічу Сеўруку. З пашанай не толькі за ўзрост, хаця, між іншым, і гэта «дэталь» — даволі істотная. Пяць гадоў ужо ляжыць недзе на паліцы, пакрываецца пылам пенсіённая кніжка Івана Аляксандравіча. Пяць гадоў у гарадской утульнай кватэры на беразе Чорнага мора чакае свайго «старога вандраўніка» жонка. А ён тут на будоўлі, бегае, як падлетак, завіхаецца і думаць не думае пра тую пенсію, хаця матэрыяльна ён нічога не страціў бы, каб пайшоў на адпачынак. Але не будзем крыўдзіць чалавека, нагадваць яму пра пенсію, пра спакой, бо ён, як заўсёды ў такіх выпадках, у адказ толькі калюча блісне вачыма і адрэжа:

— Ну, што вы ад мяне хочаце? Хіба вы не ведаеце, што без работы я і дня аднаго не вытрымаю!

Колькі б ні сустракаў у жыцці такіх вось людзей, ніколі не перастанеш здзіўляцца моцнаму гарту іх характараў. Адкуль у чалавека, якому даўно ўжо шуганула за шосты дзесятак, такая бясконцая няўрымслівая прага стварэння? Можа, жыве яна з тых далёкіх гадоў нашых першых пяцігодак, калі рускі рабочы Іван Сяўрук назіраў, як замежныя спецыялісты манцыруюць катлы нашых электрастанцый? І як самаўпэўнены, ганарлівы гусак, нямецкі інжынер Нэй у белай шапцы стукаў кіем па металу і пакрыкваў: «Фось тут, Іван, закруці гайку... Цяпер фось тут...» Маўчаў, «круціў гайкі» Іван, а потым узяў ды і выкінуў штуку — наогул адмовіўся ад паслуг замежнага спецыяліста. Самастойна пачаў манціраваць, «збіраць» катлы ў Нікалаеве, у Адэсе, на Краматорскай ГЭС, Севастопальскай, Кішынёўскай, Херсонскай — ды хіба можна пералічыць усе электрастанцыі, дзе працаваў ён за трыццаць гадоў. Кіньце вокам на карту Савецкага Саюза: амаль у кожным яе месцы засталася разам з электрычнай энергіяй часцінка яго жыцця.

І цяпер вось Бяроза, новая беларуская электрастанцыя. Праўда, мантаж катлоў вядуць тут другія людзі — Масленікаў і Брус, але хіба тое, што робіць Сяўрук — рэгуліроўка мантажных пляцовак і выраб стропаў для кранаў, справа менш важная, менш неабходная для будоўлі?

І. А. Сяўрук.

Р. Ц. Дольская.

І. С. Гродзь.

Другі партрэт — Раісы Ціханаўны Дольскай. Гэта яна і «ў мароз і ў спякоту» выходзіла са сваёй брыгадай працаваць туды, дзе механізмы адмаўляліся памагаць чалавеку. Паспрабуйце сказаць Раісе Дольскай, што капаць канал, стоячы па калені ў вадзе, — гэта таксама подзвіг, — яна мякка ўсміхнецца і здзіўлена паглядзіць на вас: што, маўляў, тут асаблівага? Трэба ж гэта каму-небудзь рабіць, не нам, дык іншым. Вось у вайну, там сапраўды былі подзвігі...

А ў вайну маладзенькая санітарка з-пад Гомеля Рая ездзіла з эшалонамі, падцірала лужыны крыві, выносіла раненых на насілках у час бамбёжкі. Потым у фашысцкім канцлагеры, недзе на тэрыторыі Францыі вывучала яна закон святога братэрства людзей, што трапілі ў смяротную небяспеку. Успамінаюцца і цяпер сустрэчы з чэхамі, французамі і палякамі, з усімі, хто памог рускай дзяўчыне застацца ў жывых.

Раісе Дольскай няма калі пазіраваць мастаку. Вось яна прысела на хвілінку ў баковачцы начальніка ўчастка і адразу ўжо заспяшалася: трэба ісці, там чакаюць, там сёння неспадзявана абваліўся грунт... Нельга затрымаць ні на адну хвіліну будаўнічыя работы. Хутка ж пуск наступнай чаргі электрастанцыі!

Мастак знаёміць вас яшчэ з адным чалавекам з будоўлі — Іосі-

САВЕЦКАЯ КНІГА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна адкрыта выстаўка «Савецкая кніга ў Чэхаславакіі», арганізаваная Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

Тут знаходзяцца багата ілюстраваныя выданні ў перакладах на чэшскую і славацкую мовы — «Слова аб палку Ігаравым», творы А. Пушкіна, М. Гогаля, І. Тургенева, Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога, Ул. Караленкі, А. Чэхава, М. Горкага, М. Шолахава і многіх іншых рускіх і савецкіх пісьменнікаў.

На выстаўцы ёсць і творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў у перакладах Я. Альды, М. Марчанковай, З. Скібы, Я. Гораца, В. Машковай, І. Свабоды, З. Бераковай, Я. Гуляка, М. Мервартавай, Г. Урбовай, Э. Котрбы, Ул. Смерна і іншых сучасных літаратараў сацыялістычнай Чэхаславакіі.

Наведвальнікі выстаўкі з цікавасцю знаёмяцца з чэхаславацкімі выданнямі кніг беларускіх аўтараў. Сярод іх — «Паэты Беларусі», «На ростанях» Я. Коласа, «Тры пальцы» (апавяданні) Зм. Бядулі, «У Забалоцці днее» Я. Брыля, «Мінскі напрамак» І. Мележа, «Кніга вандраванняў і любові» П. Панчанкі, «Вяснянка» Т. Хадкевіча.

Л. БАЯРСКІ.

З вясновым ветрыкам

Літаратурныя пароды

Цудоўны малюнак вясны стварыў Якуб Колас. Помніце! Перачытайце, калі хто забыўся.

А як такі пейзаж выглядаў бы пад пяром іншых пісьменнікаў? На гэтае пытанне паспрабаваў адказаць Георгій Юрчанка.

Вясна была ранняя... У лясах на ўгрэвах снег злазіў борзда, і вызваленая з-пад снегу зямля радасна выглядала на свет жаўтавата-шэрымі плямкамі, ужо выбіваўся і леташні бруснічнік, свежы і сакавіты, сухія галінкі вераску і ягадніку. Побач чыгункі, дзе так прыемна купаліся залатыя косы сонейка, у зацішку зялёных хвой і чырванаватага маладога бярэзніку, ужо цягнулася доўгая жоўтая паласа адтаўшай зямлі. Яна шырэла з кожным днём, з кожнай гадзінай.

А каля масткоў на чыгунцы стаяў вясёлы гоман звонкіх кропель, сцякаючых у ажыўшыя рачулкі і ручайкі. Засыпаныя снегам шпалы, старыя трухлявыя пні даўно загубленых дрэў, гнілыя галіны — ўсё выглядала з-пад снегу і ўсё, здавалася, радавалася, што не апошні раз бачыла сонца. А лес, асветлены і абагрэты сонцам, пазіраў зусім-такі весела. І было штосьці незвычайна прыемнае ў гэтых першых светла-бліскучых іскрынках абуджэння жыцця, у гэтым зямлістым паху прэлых леташніх лісцяў, дзе-нідзе шарэўшых на зямлі. І зусім іншыя струны душы закраналіся гэтым кволым патыханнем вясны, і іншыя парыванні разам з абуджэннем прыроды калыхалі душу ціхаю, няяснаю песняю ці даўно чутаю казкаю, поўнаю харавства і чараў, і кудысь цягнулі і клікалі.

ЯКУБ КОЛАС
(На ростанях. Кніга першая, XXVIII)

Пілíп ПЕСТРАК

Непарушную цішыню Ускрайгаю аднойчы ў нядзелю разарвала такая патрэбная вясна. На ўгрэвах снег злазіў настолькі борзда, што здавалася, нехта нябачны ўладарна здзьмухваў яго, і вызваленая ад снегавых пут зямля са спрадвечнай радасцю глядзелася на свет шматкаляровымі плямкамі. У філасофскім роздуме застыў бруснічнік, свежы і сакавіты, як і ў часы вялікага князя Алега Кіеўскага. Сухія галінкі вераску і ягадніку, яшчэ так нядаўна жывыя і гаманліва-ўзрушаныя, цяпер выглядалі недарэчна і пачварна на агульным фоне абуджэння і красавання.

Там, дзе пасяліся стракатым дываном хмызы, чыгунка адным махам перасякала канал. Каля масткоў, калі прыслухацца, стаяла вясёлая гамана талай вады, якая радасна цурчала ў ручаінку. Такія ручаінкі, то большыя, то меншыя, але ўсе перапоўненыя — чым бы вы думалі? — вадою, не спяшаючыся цяклі ў канал, яшчэ больш поўны і паабрастаны кусцём ніцай лазы. З правага боку ў канал з шумам уліваўся вялікі ручай, амаль рэчка, іграючы з зіхаценнем і вясёлым бляскам. Да імклівага пошуму прыслухоўваліся шпалы, старыя трухлявыя пні даўно зваленых дрэў, шкадуючы аб загубленай маладосці і спілаванай сталасці, гнілыя галіны, якім працяглы час не хапала цяпла і сонца і якія ў сілу гэтых абставін не маглі канкурыраваць са сваімі шчаслівейшымі сёстрамі. Але вясна ёсць вясна, а, значыць, і тое, што, здавалася б, павінна ўпасці ў адчай і роспач, радавалася, што яшчэ раз убачыла сонца. Раскідзісты памаладзелы Ускрайгай, поўны неўсвядомленага жадання, пазіраў зусім-такі весела. І столькі прыемнага было ў светла-бліскучых іскрынках абуджэння жыцця, што маладзіліся сокі ў дрэвах, асабліва ў бярозах, нібы кроў у жылах людзей перад шлюбнай ночай. Нават у зямлістых пахах прэлых леташніх лісцяў, там і сям шарэўшых на зямлі, адчувалася дыханне векавечнай праўды ўзнаўлення. А якія неспадзяваныя павароты ўносіла кволае патыханне вясны ў няспынную плынь штодзённага чалавечага жыцця! Душа то перапоўніцца без дай прычыны ціхусенькай сарамлівай радасцю, то яе штосьці абдасць як з вядра непрытоеным сумам. Толькі мінорныя песні і даўжэзныя казкі гучаць магутна і ўладарна і цягнуцца бясконца, як бясконца само быццё.

Алена ВАСІЛЕВІЧ

«...Мілы сябра! Сёння вясна. Мне зусім не хочацца пісаць пра зіму. Снег ужо злез, быццам яго і не было. Шырачэзныя зямныя прасторы глядзяць — не наглядзяцца на свет, які так нечакана адкрыўся перад імі, глыбокімі-глыбокімі вачыма азёр і, здаецца, удыхаюць крохкае хмеліва сінявы. Уяўляеш?

Недалёка ад нас праходзіць чыгунка. Выйду, стану пад покрыва зялёных хвой і чырванаватага маладога бярэзніку і любуюся залацістымі іскрамі сонейка, што купаецца на ўгрэве ў жоўценькім пясочку. Адталая зямля налілася буйнымі сокамі. Яе моц расце з кожнай гадзінай, з кожным імгненнем.

Учора, дарагі дружа, прайшоў заўзяты, спорны, зусім летні дождж. З мастка на чыгунцы сцякалі важкія кроплі, хутка і весела перагаварваючыся з ажыўшым капрызным ручайком. Хмурынка неўзабаве рассеялася. Яе рэшткамі абцёрлася памаладзелая зямля. Старыя шпалы, цесна прыціснуўшыся адна да адной, задумліва грэлі свае пачарнеўшыя бакі. Ці паверыш, любы, я пераходжу чыгунку і адразу трапляю ў абдымкі асветленага і абагрэтага меднастволага бору. Трухлявыя пні выглядаюць памаладзелымі. Яны, падобна, прыселі ў мудрагелістым рэверансе. Гнілыя галіны ўжо зусім высахлі і, здаецца — ні больш, ні менш, — аж просяцца ў агонь. Прырода, бясспрэчна, не апошні раз бачыла сонца. Мне насустрач елкі асцярожна працягвалі свае махнатыя лапы, асіны беражна кідалі свае дрыгатлівыя сярожкі. Трэба было бачыць, як я бяру пяшчотна-кволыя пупышкі івы, гладжу, а потым... падношу да губ, цалую. Яны пахучыя, жывыя. Хіба аб гэтым раскажаш? На паперы толькі бляклы след маіх адчуванняў. І — запомні! — аб гэтым я пішу толькі табе. Мне пад ногі кладзецца леташні пругкі бруснічнік, здзіўлена пазіраюць на наваколле першыя лісточкі вераску, а прывабна - зялёныя трохкутнічкі ягадніку нібы запрашаюць — прыйдзі да нас праз месяц... Ад леташняга лісця, якога можна было нагрэбці не адны рэзгіны, і счарнелай травы цягнула прэла-зямлістым пахам, але светла-бліскучае жыццё разганяла гэты пах неўтаймаваным водарам абуджэння. Цяпер я катэгарычна перакапана, што жыццё абудзілася на поўную сілу.

Я не магу не напісаць, што дыханне вясны настырна ўрываецца ў душу і кратае ў ёй самыя патаемныя струны, тыя... што берагу табе. І перад вачыма паўстае зусім новая, яшчэ няведаная планіда. А ў сэрцы гучыць даўно вынашаная песня і сотні разоў расказаная казка — расказаная для цябе. Ці чуў ты яе?..

Алёнка».

30 красавіка 1963 года.

Іван МЕЛЕЖ

Дзень за днём сонца падымалася ўсё вышэй і вышэй. Нарэшце палескія вятры прынеслі адлігу. Снег пачаў асядаць, вадзяніцца; нібы сціскаўся пад сонечнымі праменнямі, адпаўзаў у кусты, забіраўся ў канавы, шукаў сховішча ў засені лясоў, але цеплыня няўмольна выпорвала яго з самых патаемных куткоў. Вясна ўзялася дружная, настырная. Вызваленая з-пад снегу зямля глядзела на свет, дзе жаўтавата-шэрымі плямкамі, дзе ўгрэтымі палянкамі, а дзе і цэлым полем. Халоднае шырокае разводдзе заліло балота, як воку згледзець, і цягнулася да самай крайняй высыпы, што ледзь віднелася каля адзінокіх алешын на тым баку. З вады адно вылазілі чорныя дзеркачы кустоў і някрэпка звязаныя мётлы шурпатых бярэзнікаў; адзінока тырчала кассё чамусь не ссечанай елкі. Толькі праз некалькі дзён на балотнай нібы застыглай люстраласці ледзь пачалі выглядваць купіны асакі-разухі. Следам пачалі выбірацца з-пад вады ўжо цэлыя астраўкі — сакавіта-зялёная радасць. І нарэшце прыйшоў час, калі з балота праз увесь узболатак выступіла доўгая жоўтая паласа пясчанай зямлі. Яна шырэла з кожным днём, з кожнай гадзінай. Сонца яе падсушыла і ахвотна купала ў ёй свае залатыя косы. Пад шырокімі разлапістымі елкамі выбіваўся з-пад снегу леташні бруснічнік, свежы і сакавіты.

— Ето ж трэба, каб я прапаў, калі буў такей дзень! — млява выдаўліваў з сябе стары трухлявы пень, звяртаючыся да двухмятровай кладкі дроў пад кашлатай сасною.

— Аге, праўдо, сусед, грэц яго, — ахвотна падтрымалі дровы.

— Етаго шчэ не було і мабуць не будзе, — падтакнулі гнілыя галіны.

Яшчэ весялей пагляддаў стары лес, асветлены і абагрэты сонцам. І было штосьці не самае прыемнае ў гэтым нясцерпна жаданым абуджэнні жыцця, у неўтаймоўным росквіце, руплівых шумах, у хмялёвым водары зямлі. Нейкія ціхія шчыплівыя струны душы пяшчотна кранала гэта нясмелае патыханне. А з-за балота даляталі нейкія няясныя песні, ледзь чутныя казкі і клікалі ўзняцца ў бліскучыя фарбы дня і пераляцець і гэту дрыгву, і напаўразмытую грэблю, і разбураны паводкаю масток.

Алесь ШАШКОЎ

Вясна. Хіба мала аб чым гаворыць гэта слова? Сліпуча-яркае сонца, блакітнае-блакітнае неба. На ўгрэвах летанні бруснічнік, свежы і сакавіты, у якім блытаюцца ногі, даўгая трава, пасівелая пад снегам, галінкі вераску. Уздоўж чыгункі выстраіліся падцягнутыя маладыя таполі і каржакаватыя старыя бярозы. На поўдзень ад чыгункі разбягаюцца, хаваючыся па лагчынках, нізкарослыя хмызнякі. На поўнач разлёгся лес. У самай яго гушчэчы схавалася цьмянае возера. Гэта было дзівоснае вадасховішча. Узровень вады ў ім ніколі не павышаўся і не паніжаўся, хаця сюды ўпадала даволі вялікая рэчка Газель і не выцякала ніводнага ручайка

Хлапчукі Хомка і Кузьма мінулі чыгуначны пераезд і праз колькі метраў апынуліся ў лесе. Густы гаркаваты водар прэлага лісця прыемна казытаў у носе. Дарога да Цьмянага ім добра была знаёма. На палове шляху яны адным махам пераскочылі Газель.

А вось і возера. Выгляд яго жудасны. Старадрэвіны верхавінамі зваліліся ў ваду. Карэнне іх вывернулася і мела выгляд нейкіх пачварных жывёлін, застылых у вар'яцкім прыжку. Месцамі над чорным бяздоннем звісала перапляценая хмелем лаза. Гліна з берагоў атколвалася пластамі зверху ўніз, ад гэтага стромкія абрывы нагадвалі сцены замка, у якім жылі нейкія страшыдлы. Хадзілі гутаркі, што ў возеры няма дна. Нечакана сябры ўбачылі—з чорнай нетры возера, пасярэдзіне, паказаўся чалавек і паплыў да берагу. Кузьма і Хомка ўміг яго пазналі. Гэта быў Дзікун, шпіён міжнароднай катэгорыі. Хлопцы стаіліся ў кустах. Не паспеў Дзікун вылезці на бераг, як сябры, настаўіўшы на яго палкі, нібы рулі аўтаматаў, грозна крыкнулі:

— Рукі ўверх!

Дзікун затросся і паслухмяна падняў рукі.

— Уперад! Не азірацца! — закамандаваў Кузьма.

У светла-бліскучых іскрынках сонца, у кволым патыханні вясны шпіён выглядаў недарэчна. З бадзёрай песняй «Мы шпіёнаў пераловім!» крочылі сябры за Дзікуном. Душы іх былі перапоўнены радасцю і гордасцю.



У новы дзень, у новы свет...

Усё, што ёсць цудоўнага на нашай зямлі, мы бяром з сабою «ў новы дзень, у новы свет». І гэтыя бярозкі, і гэтую дарогу, па якой спяшаецца некуды аўтобус. І талент і натхненне мастака, калі сапраўды ён здолее перадаць людзям сваёй палітрай часцінку дыхання зямлі.

Дзе б ні жыў мастак, у Маскве ці ў Казахстане, у Мінску ці ў Полацку, ці ў Магілёве на Дняпры, вось як Аркадзь Кандрусевіч, з якім знаёміць вас сёння фотакарэспандэнт, ён знойдзе, ён абавязкова здолее знайсці тую непаўторную прыгажосць, на якую адгукнецца душа кожнага чалавека. І чалавек яшчэ больш палюбіць сваю зямлю, зямлю, на якой жывуць людзі-стваральнікі.

МАЛАДЗЁЖНАЯ СТУДЫЯ

Пры Беларускім політэхнічным інстытуце працуе студыйны маладзёжны тэатр. Ён аб'ядноўвае каля 40 чалавек. Кіруе тэатрам заслужаны артыст Беларускай ССР М. Федароўскі.

Гэтымі днямі калектыў самадзейных артыстаў закончыў работу над новай пастаноўкай па п'есе чэхаславацкага драматурга Браціслава Блажака «Шчодры вечар».

П. БАРОДКА.

ТЭАТР ЛЯЛЕК У ГОМЕЛІ

У Гомелі пачаў працаваць Тэатр лялек, створаны калектывам Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Юныя гамяльчане пазнаёміліся са спектаклем «Прыгоды Нязнайкі» (па аднайменнай кнізе М. Носава).

Гэтымі днямі артысты паказалі сваю першую работу дзецям рабочых «Гомсельмаша».

ГУЧАЦЬ ЦЫМБАЛЫ

З вокнаў Пінскай музычнай школы чуваць галасы шматлікіх інструментаў — раяля, скрыпкі, віяланчэлі, баяна, домры.

А зусім нядаўна ў гэтую своеасаблівую сімфонію ўліліся меладычныя гукі беларускіх цымбал. Гэта не выпадкова. У школе па шматлікіх просьбах працоўных адкрыты клас цымбал пад кіраўніцтвам выкладчыцы Зоі Каладзеюк.

С. ШАПІРА.

Георгій ПАПОЎ



АПАВЯДАННЕ

Прыйшоўшы з работы, мама сказала, што ім, нарэшце, даюць новую кватэру.

Цыбатая Алка, якая зубрыла нямецкую мову (яна вучылася ў інстытуце замежных моў), шыбанула сшыткі на стол і заскакала, як маленькая.

А васьмікласніца Майка выгукнула:

— Ах, якое шчасце!—і, робячы выгляд, быццам яна ўзрушана гэтай навіною, плюхнулася ў крэсла. Падскочыўшы, зноў стала на ногі. Атрымалася ў яе гэтак удала, што Юрка нават пачырванеў ад зайздрасці.

— Ну, досыць, досыць,—усміхнулася маці.

Потым яна стала сур'ёзная і сказала, што ўсю старызну трэба некаму прадаць. І канапу, і крэслы, і стол з расколанай ножкай,—усё.

— А скрыню?—спытаўся Юрка.

Алка засмяялася.

— Наіўнае дзіцянё! Скрыню мы здадзім у музей як помнік праклятага мінулага. Там яе папырскаюць бабулінымі духамі і выставяць, каб усе бачылі.

Юрку чамусьці стала весела. Ён таксама з разгону плюхнуўся ў крэсла і таксама падскочыў, як гэта зрабіла Майка. Але стаць на ногі не змог. У яго гэта не атрымалася.

А потым пайшлі пакупнікі. У большасці гэта былі бабулі з маленькімі чорнымі і шэрымі вачыма. Яны разглядалі этажэрку, давілі кулакамі мяккія крэслы, адчынялі і зачынялі старажытную шафу. Маці казала цану, а бабулі адчувалі сябе ніякавата, ківалі сівымі, быццам пасыпанымі пудрай, галовамі і выходзілі з пакоя.

Толькі адна бабуля—худая, бледная, з карычневай барадаўкай на верхняй губе—ніяк не хацела выходзіць. Ёй, пэўна, падабаліся і шафа, і крэсла, і этажэрка, і яна наважыла купіць гэтае дабро.

— Два рублі—гэта мала?—картава пытала яна, разглядаючы этажэрку,—а хто вам больш дасць? І крэслы дрэнь... Дзесяць рублёў хочаце? Не, не, і капейкі не набаўлю. А шафа... Хіба гэта шафа? Гэта не шафа—дровы! Не надумайце паказаць яе прыстойным людзям, бо тут і паказваць няма чаго. Ну, дамовіліся? Гэткая прыгожая дамачка, а таргуецца, прабачце, за кожную капейку.

Мама была дзіўная, яна не ўмела жыць і тым больш таргавацца, і ўрэшце махнула рукою: так і быць, бярыце! Бабулька кінула маці пяць рублёў задатку і, сказаўшы, што заўтра яна забярэ гэтую старызну, выйшла.

— Віншую з выгаднай здзелкай!—пакпіла Майка.

— Адчапіся!—зазлавала маці.

— А скрыня? Мы забыліся пра скрыню. Не ў музей жа яе цягнуць, сапраўды!—выгукнула Алка і кінула пагардлівы позірк на скрыню.

Маці таксама зірнула на скрыню. І Юрка зірнуў—не пагардліва, як Алка, а з нейкай патаемнай надзеяй. А Майка залезла на века скрыні, абабітае жалезам, і пастукала абцасікамі. У сярэдзіне нешта заенчыла, зазвінела, пэўна, замочная спружына, а са шчылін вырваліся фантанчыкі пылу.

— Фу, якая брыда!—Майка саскочыла на падлогу.

— Скрыню таксама трэба прадаць. Там яе і паставіць не будзе дзе, ды і старамодная яна. Колісь у такіх скрынях вазілі пасаг,—мама ўздыхнула, як яна ўздыхала кожны раз, калі ўспаміналa пра мінулае.

«Там»—гэта на новай кватэры. А што такое пасаг, Юрка не ведаў добра, хоць і глядзеў па тэлевізары вясёлы фільм «Вяселле з пасагам». Дапытвацца не стаў. Па-першае, маці было не да яго. Яна трошкі была збянтэжана, што аддала рэчы задарма. А па-другое... а па-другое, Юрку цяпер цікавіў не пасаг, а скрыня маміпай бабулі.

Юрку здавалася таямнічай гэтая скрыня, і рэчы ў ёй былі дужа цікавыя, якіх болей ні ў кога не было. Скрыня пафарбаваная была нейкай зялёнай фарбай, якой не адкалупнеш нават пазногцем. Юрка спрабаваў гэта рабіць, і не раз, аднак, у яго нічога не выйшла. А з сярэдзіны века абклеена дзіўнымі паперкамі. Там былі і яркa чырвоныя ракі з надпісам «карамель», і старыя грошы, якія маці называла «катарынкамі», і коннікі на белых і зялёных конях. Такіх паперак цяпер нідзе не дападзеш, нават за грошы не купіш.

А галоўнае, вядома, рэчы. Калі маці адчыняла скрыню, Юрка садзіўся поруч на кукішкі і ўсё хацеў пакратаць рукамі што-небудзь. Часам скрыня заставалася адамкнутай на дзесяць ці дваццаць хвілін, і тады Юрка корпаўся ў ёй, як гаспадар. Ён перабіраў фотакарткі, на якіх былі зняты вусатыя мужчыны, адны з пагонамі, другія без пагонаў, але ўсе ў шапках і пры зброі,—і прыгожыя жанчыны з гладкімі прычоскамі. Жанчыны не цікавілі Юрку зусім. Гэта ад мужчын ён не мог адарвацца. У такія хвіліны яму хацелася прывалачы сюды да скрыні Борку, суседавага хлопчыка, які ганарыўся тым, што яго тата дырэктар, а старэйшы брат—ваенны лётчык, сказаць:

— Вунь, паглядзі!—і тыцнуць яго носам у фотакарткі.

З таго, што расказвала Юркава маці, хлопчык ведаў, што на фотаздымках яго продкі. Тут і прадзед Мікалай Іванавіч, які змагаўся з туркамі на Шыпцы, і дзядуля Пятро Мікалаевіч, матрос з «Варага», пра які складзена песня, і дзядзька Сымон Пятровіч, чырвоны камандзір-будзёнавец і другі дзядзька, Ягор Пятровіч, таксама камандзір і таксама чырвоны, толькі ваяваў ён не ў Будзённага, а недзе ў Сібіры, супраць нейкага Калчака, і, нарэшце, Юркаў тата, самы малады з сям'і, артылерыст, які прайшоў са сваёй гарматай ад Масквы да Берліна. Былі ў скрыні фотакарткі і іншых мужчын, але хто яны такія, — не ведала нават маці. А можа і ведала, ды не хацела расказваць.

Юрка не памятае бацькі, не памятае, каб у кватэры ў іх былі мужчыны, і ганарыцца сваімі продкамі. Ганарыцца не меней, чым Борка братам, ваенным лётчыкам. Нават болей. У Боркавага брата ніякіх узнагарод няма. Юрка бачыў гэта, калі ён прыязджаў у госці. А ў тых, хто зняты на картках, якія ляжаць у скрыні, гэтых узнагарод, дык, мабыць, аж лішне! І крыжы, і медалі, і ордэны. Мама кажа, што яны не ўсе яшчэ захаваліся, а то б і скрыні не хапіла. Вось якія яны, Юркавы продкі. Калі Юрка вырасце... Але да таго часу, калі Юрка вырасце, яшчэ далёка, і ён пра гэта пакуль не думае.

Але і гэта не ўсё. Быў у скрыні вялікі жоўты гузік з чыстага бурштыну, які быццам падарыў прадзеду Мікалаю Іванавічу храбры гайдук перад боем з туркамі. Так гэта ці не—хто яго ведае! Аднак, калі маці гаворыць, значыць так. Ды хіба мае якое значэнне, хто падараваў. Юрка нават не запытаў, хто такія былі гайдукі. Яго цікавіў сам гузік—яркі, бліскучы, падобны на кавалачак сонца. Цудоўны гузік! Варта яго ўзяць у рукі, як ён пачынае свяціцца знутры, гарэць залацістым полымем. Ён і ў скрыні гарыць, толькі не гэтак ярка, як на далоні. Калі б Юрку далі гэты гузік, ён паказаў бы яго Борку, і той, пэўна ж, не адышоў бы ад яго ні на крок.

— Вядома, трэба прадаць, — уставіў слоўца Юрка, хоць гэтага яму не трэ' было рабіць. Маці злавала, калі ён умешваўся ў размову дарослых.

— Прадаць то прадаць, ды хто купіць?

Але сама сабе яна, вядома, думала, што пакупнікі знойдуцца. Гэтай жа скрыні яшчэ на век хопіць, яна сама гэта казала, і рэчы захоўваць у ёй вельмі добра. Складзеш, замкнеш на замок, і няхай ляжаць.

— Не купяць, дык дарма аддадзім. Падумаеш, гістарычная каштоўнасць, — усміхнулася Алка.

А Майка сказала:

— Ну, дарма,—гэта ўжо занадта!—і сцепанула плечкамі.

Назаўтра Юрка сустрэўся з Боркам. Сустрэліся яны на двары пад ліпамі, якіх насадзіў дзядзька Мікола. Дзіўны чалавек быў гэты дзядзька Мікола. Нездарма яму і мянушку далі—дзівак. Ён жыў унізе, у паўпадвале, нідзе не працаваў, бо яму давалі пенсію па інваліднасці. Жонкі ў яго не было, дзяцей таксама, і ўсё ён рабіў сам—і на рынак хадзіў, і яду сабе гатаваў, і нават мыў бялізну. А ў вольную хвіліну майстраваў нешта на двары малатком і сякераю. То ён правіў агароджу, то будаваў альтанку, а то ўтыкаў якое-небудзь дрэўца.

Аднаго разу ён прывёз на тачцы маладзенькую ліпку і пасадзіў яе ў самым занядбаным кутку двара, потым другую, трэцюю..., гэтак і вырас у двары ліпняк, зялёны, расны. Дзядзька Мікола зваў гэты ліпняк куточкам прыроды. У спякотныя дні, калі сонца смаліла макаўку яго галавы, ён садзіўся ў альтанцы пад ліпамі і чытаў газеты. Іншы раз ён прападаў недзе цэлымі днямі і вяртаўся п'яны, раскудлачаны і быццам вінаваты. Ён не крычаў, не сварыўся, як іншыя п'яныя, не рваў на сабе кашулі, не! Проста сюд-туд хадзіў і сарамліва ўсміхаўся, казаў кожнаму, каго ён сустракаў:

— Прабачце... Гэтак здарылася,—і ківаў галавою.

Потым высвятлялася, што колькі год назад пад Тарнопалем ці Залачовам (гэта на Украіне) нейкі плюгавы фашыст акурат у гэты дзень усадзіў у яго, у дзядзьку Міколу, пятую па ліку—і апошнюю за ўсю вайну—кулю. Надараліся і іншыя прычыны, і ўсе яны былі звязаны з вайною.

От пад гэтымі дзядзькавымі ліпамі Юрка і сустрэўся са сваімі сябрукамі.

— А нам даюць новую кватэру,—пахваліўся Юрка.

— Хлусіш!—не даў веры Борка.

— Чэснае піянерскае!

— Ну, і няхай! Нам таксама дадуць, калі тата захоча.

— А няхай ён зараз захоча. Разам паедзем. Мы прадалі ўжо этажэрку, два крэслы, стол.... І скрыню прададзім. Мама сказала, што яе купяць.

— А ты мне крыж падарыш?

— Падару,—махнуў галавою Юрка. Ён раптам гэтак раздабрыўся, што гатовы быў падарыць не толькі крыж ці медаль, але і жоўты гузік.

— А я табе—жука,—паабяцаў Борка.

Яны пагулялі трошкі ў перагонкі і разышліся, бо Борку паклікалі снедаць.

Юрка вярнуўся дадому на старую кватэру, якая здалася яму цеснай і няўтульнай. Кніжкі з этажэркі паздымалі, і яна чамусьці скасабочылася. Крэслы прысунулі да стала. У кутку паміж зэдлікамі і аблупленай сцяной, вырасла горка папяровых каробак з туфлямі і ёлачнымі цацкамі. Тут жа ляжалі звязаныя розныя трапты.

Мама, Алка і Майка пабылі ўжо на новай кватэры і цяпер абмяркоўвалі, як там усё ставіць. Слухаючы іх, Юрка зразумеў, што тая кватэра не зусім і новая. Яе займаў матчын начальнік, дырэктар інстытута, у якім працуе маці. Цяпер дырэктар перабярэцца ў цэнтр горада ў чатырохпакаёвую кватэру, а сваю старую перадасць ім. У старой дырэктаравай кватэры тры невялічкія пакоі, кухня, ванная, туалет і каморка. У адным пакоі будзе мамін кабінет. Там паставяць яе ложак, у другім будуць жыць Алка і Майка, а трэці агульны. Тут, у агульным, на канапе, якую мама абяцала купіць, і будзе спаць Юрка.

— Ну, як?—спытала маці.

— Добра,—згадзіўся Юрка, прыкінуўшы, што калі ён будзе спаць у агульным пакоі, значыць, гэты агульны стане як бы яго ўласным пакоем.

А ўвечары, калі запалілася электрычнасць, у кватэру ўваліліся без стуку тры чалавекі. Адна была бабуля, тая самая з карычневай барадаўкай, якая звала маму прыгожай дамачкай. З ёю былі два дужыя хлопцы, рыжы і чарнявы. Неўзабаве прыйшоў і дзядзька Мікола. Ён быў веселаваты і, як звычайна, прасіў прабачэння і ківаў галавою.

Бабуля тыцнула маці тоненькі пачак блакітных пяцірублёвак, набавіла яшчэ рубель дробяззю і паказала на крэслы, этажэрку, канапу і стол з расколанай ножкай. Хлопцы, здавалася, гэтага толькі і чакалі. Рыжы схапіў аберуч этажэрку, чарнявы ўскінуў на загорбак цяжкае крэсла,—і абодва затупалі па лесвіцы. Чуваць было, як яны пералічваюць прыступкі новымі абцасамі. Бабуля спытала, ці не прадаюцца і гэтыя новыя крэслы? Маці адмоўна паківала галавою. Яны былі новыя і прадаваць іх ніяк не выходзіла. Скрыня—іншая справа. Калі, маўляў, пажадаеце, то скрыню мы прададзім з прыемнасцю.

— Скрыню? А што такое скрыня?—бабуля, прыжмурыўшы вочы, паглядзела на маці.

Маці падышла да скрыні, пстрыкнула ключом, падняла века. У вочы кінуліся чырвоныя ракі з надпісам «карамель» і пажоўклыя «катарынкі». Бабуля таксама падышла да скрыні, яна зачыніла, потым зноў адчыніла яе, пакалупала пазногцем зялёную фарбу, спытала, колькі хочуць за гэтую скрыню. Маці сказала, што рублёў шэсць, не меней.

— Шэсць рублёў! За гэтыя дровы! О, божухна мой!—як не жахнулася старая.—Ды калі вы мне, прыгожая дамачка, і дарма аддасце яе, дык я падумаю перш, чым узяць. Навошта яна... гэтая, як яе... Не, не!

— Шэсць рублёў!—сказаў дзядзька Мікола і бліснуў п'янымі вачыма.

Гэтая цана, пэўна, здалася яму малой, вельмі малой.

— А колькі вы дасцё?—засаромелася маці.

Яна і сапраўды гатовая была аддаць скрыню задарма.

— Чатыры рублі хочаце?

— Чатыры рублі! — абурыўся дзядзька Мікола.

Маці маўчала.

— Не хочаце, дык як сабе хочаце, толькі больш ні капейкі не набаўлю,—сказала бабуля, хоць маці і не збіралася таргавацца з ёю. Яна проста маўчала. Маўчала таму, што старая не давала ёй слова вымавіць.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

фам Гродзям. Можа, жыццёвы шлях яго і не такі складаны, як у Сеўрука ці Дольскай. На яго долю выпрабаванняў выпала значна менш. Хіба толькі вось... ажаніцца хлопец ніяк не можа знайсці часу. Жартуюць таварышы: глядзі, Іосіф, у «старых дзеўках» застанешся! А ён толькі чырванее ды ніжэй апускае сваю бялявую кучаравую галаву. Іосіф, чалавек наогул вельмі сарамлівы, не кожнаму прызнаецца, што недзе там на Гродзеншчыне ў вёсцы чакае яго нявеста-зямлячка. Ужо гэтай вясною ён абавязкова справіць вяселле, вось толькі крышку ўправіцца брыгада... Зімой жа ніяк нельга было выбрацца і паехаць дадому. Трэба было тэрмінова здаваць падмурак пад мантаж галоўнага корпуса. На глыбіні трох метраў прасачылася вада. Заносіла снегам, не хапала механізмаў, ды і бульдозер не мог узяць прамёрзлую зямлю. Ламамі, адбойнымі малаткамі ўгрызалася ў зямлю брыгада Гродзя...

— Праб'ём крыху за дзень, а ноччу зноў усё замерзне і назаўтра пачынай спачатку...

— Раскажы яшчэ пра «батарэйную», Іосіф,—напамінае яму прараб. — Гэта сапраўды быў подзвіг вашай брыгады.

— Ды што там казаць, нічога асаблівага. Працавалі і ўсё... — зноў Іосіф Гродзь чырванее, сарамліва апускае галаву.

...Тры партрэты, тры чалавекі, Тры жыцці, тры біяграфіі. І кожную з іх можна назваць па праву шчаслівай, светлай біяграфіяй. Бо людзі, якіх паказаў у сваёй невялічкай галерэі наш мастак, вельмі добра ведаюць: без іх не было б на зямлі ні святла, ні цеплыні, ні самога жыцця.

А галерэю мастака можна было б пашыраць бясконца. Вось яны і тут, на мантажы турбіны, і на рэпетыцыі ў чырвоным кутку—людзі з Бярозы. Іх многа, працавітых і сціплых, жыве ў Белазёрску.

А. УЛАДЗІМІРАВА.

Мантаж турбіны.

Вечарам у чырвоным кутку...

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

За заслугі ў канцэртна-выканаўчай дзейнасці і ў развіцці тэатральнага і музычнага мастацтваў Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоены ганаровыя званні: народнага артыста БССР — галоўнаму рэжысёру Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Г. Б. Шчарбакову, салістцы Беларускага тэатра оперы і балета Т. І. Шымко; заслужанага дзеяча мастацтва БССР — галоўнаму балетмайстру Беларускага тэатра оперы і балета А. Л. Андрэеву; заслужанага артыста БССР — дырыжору Тэатра оперы і балета І. С. Абрамісу, салістцы Дзяржаўнага народнага хору БССР М. Ул. Адамейка, артысту Белдзяржфілармоніі Р. В. Дзідзенку, артыстам тэатра імя Я. Купалы В. П. Тарасаву і С. Ф. Хацкевічу, салісту Тэатра оперы і балета В. М. Чарнабаеву.

Віншуем вас, таварышы, з атрыманнем ганаровых званняў і жадаем новых творчых поспехаў!

Георгій Барысавіч Шчарбакоў, скончыўшы Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага, працаваў рэжысёрам і артыстам, узначальваў мастацкае кіраўніцтва ў розных тэатрах краіны. У гады вайны Г. Шчарбакоў — галоўны рэжысёр Маскоўскага франтавога драматычнага тэатра, выступае перад байцамі ў ролі Уладзіміра Ільіча Леніна ў спектаклі «Чалавек з ружжом». Пазней ён працаваў у Маскоўскім мастацкім тэатры, рэспубліканскім Тэатры рускай драмы ў Вільнюсе.

Апошнія гады творчасць Г. Шчарбакова аддадзена беларускаму мастацтву. Працуючы галоўным рэжысёрам Тэатра імя Я. Коласа, ён ажыццявіў шэраг таленавітых спектакляў, сярод якіх найбольш папулярныя «Навальніца будзе» па трылогіі Я. Коласа, «Лявоніха» па п'есе П. Данілава, «Крыніцы» па раману І. Шамякіна (у апошнім творы ён з'яўляецца і сааўтарам інсцэніроўкі).

Цяпер народны артыст БССР Г. Шчарбакоў узначальвае мастацкае кіраўніцтва Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

□

Народная артыстка рэспублікі Тамара Іванаўна Шымко — вядучая салістка Беларускага тэатра оперы і балета. Яна валодае прыгожым лірычным сапрана мяккага, празрыстага тэмбру, унутранай прывабнасцю і яркай тэмпераментнай ігрой. Пасля заканчэння ў 1952 годзе Беларускай кансерваторыі Т. Шымко адразу была прынята ў трупу опернага тэатра. На яго сцэне таленавітая спявачка стварыла цэлы рад цікавых і запамінальных вобразаў. На высокім мастацкім узроўні выконвае яна вакальныя партыі Тацяны з «Яўгенія Анегіна», Іяланты ў аднайменнай оперы Чайкоўскага, Маргарыты з «Фауста» Гуно, Мікаэлы ў «Кармэн» Бізэ, Манон з аднайменнай оперы Маснэ, Марысі ў «Міхасі Падгорным» Цікоцкага і інш.

□

Аляксей Леанідавіч Андрэеў з 1960 года ўзначальвае балетную трупу Беларускага тэатра оперы і балета. Да гэтага ён дваццаць год (1939—59) працаваў салістам балета і балетмайстрам Ленінградскага тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава. За час работы ў Мінску А. Андрэеў паставіў на беларускай сцэне творы класічнай харэаграфіі «Казка пра мёртвую царэўну і сем асілкаў», «Дон-Кіхот» і балеты беларускіх кампазітараў «Мара» Я. Глебава, «Святло і цені» Г. Вагнера. Як галоўны балетмайстар тэатра Аляксей Леанідавіч клапоціцца аб выхаванні і падрыхтоўцы творчай змены маладых здольных танцораў.

□

Пасля заканчэння Мінскага музычнага тэхнікума, а потым Белдзяржкансерваторыі па класу валторны, Іосіф Самуілавіч Абраміс быў накіраваны ў Беларускі тэатр оперы і балета. Але вайна перашкодзіла яму пачаць там работу і толькі пасля дэмабілізацыі малады музыкант стаў аркестрантам, а неўзабаве і студэнтам дырыжорскага аддзялення кансерваторыі.

Пачаўшы сваю дырыжорскую дзейнасць у 1952 годзе пастаноўкай оперы «Лакме», І. Абраміс за дзесяць год паставіў і прадырыжыраваў звыш 40 спектакляў. Сярод іх — «Шукальнікі жэмчугу», «Манон», «Вертэр», «Баль-маскарад», «Эсмеральда», «Спячая прыгажуня», «Князь Ігар» і іншыя.

Вяршыняй творчага поспеху музыканта была выдатная па дырыжорскай рабоце пастаноўка «Атэла». Для І. Абраміса як дырыжора характэрныя глыбокая музычнасць, шырыня творчага дыяпазону, добрае веданне самых разнастайных па характару оперных партытур, стрыманы і дакладны дырыжорскі жэст.

□

У Дзяржаўным народным хоры БССР з часу яго заснавання паспяхова працуе цудоўная спявачка Марыя Уладзіміраўна Адамейка. На прафесіянальную сцэну яна прыйшла з мастацкай самадзейнасці — доўгі час выступала ў аматарскіх гуртках і сама кіравала самадзейнымі калектывамі ў Барысаве, Смалявічах, Чэрвені. Больш чым за дзесяць год працы ў Народным хоры пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча М. Адамейка, якая мае гучны, прыгожы альт, вырасла ў вядучую салістку калектыву, стала лепшай выканаўцай беларускіх народных песень. Асабліва выразна, непасрэдна, з добрым пачуццём гумару запявае яна жартоўныя песні — «Маці-гераіня», «Як той Зосі давялося», «А ты ехаў, ехаў...» і іншыя.

Шырокую папулярнасць набыў створаны М. Адамейка ў садружнасці з А. Аўдзеенка вакальны дуэт.

□

Бадай што не знойдзецца на карце нашай рэспублікі такога раённага цэнтра (не кажучы пра буйныя гарады), дзе б не пабываў з канцэртнымі выступленнямі артыст беларускай эстрады Рыгор Васільевіч Дзідзенка. Яго ведаюць таксама ў гарадах Паволжа, у сярэдняй паласе РСФСР, Казахстане і нават за мяжой — у Венгрыі, куды артыст выязджаў на гастролі ў мінулым годзе.

Рыгор Васільевіч пачаў артыстычную дзейнасць у пагранічным ансамблі песні і танца. У гады Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху.

Пасля вайны Р. Дзідзенка пэўны час працаваў загадчыкам аддзела па справах мастацтва Мінскага аблвыканкома, а з 1947 года ён — артыст эстрады.

Асноўная зброя артыста — мастацкае слова. У яго рэпертуары — сатырычныя творы Уладзіміра Маякоўскага, Янкі Купалы, Якуба Коласа.

Папулярнасцю карыстаюцца таксама фельетоны, рэпрызы, пародыі і мініяцюры, напісаныя самім Р. Дзідзенкам.

□

Імя Віктара Паўлавіча Тарасава за параўнаўча кароткі час стала папулярным сярод аматараў тэатральнага мастацтва рэспублікі.

Скончыўшы ў 1957 годзе акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута па класу прафесара К. Саннікава і дацэнта А. Бутакова, малады акцёр прыйшоў на сцэну Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Ён адразу ж паказаў сябе як таленавіты мастак з яркай творчай індывідуальнасцю.

За шэсць гадоў працы Віктар Тарасаў сыграў на акадэмічнай сцэне звыш дваццаці роляў. Большасць з іх—вобразы нашых сучаснікаў: Саша Кузьмін у п'есе «Людзі і д'яблы» К. Крапівы, Міхаіл у камедыі А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце», Янаў у п'есе М. Святлова «Праз дваццаць год», Віктар Меднікаў у «Першай старонцы» Н. Івантар.

Шматграннасць артыстычнай індывідуальнасці В. Тарасава ярка праявілася таксама ў вобразах, якія стварыў ён у спектаклях «Паўночная мадонна» бр. Тур (амерыканскі лётчык Глен Роджэрс), «Уваскрасенне» па раману Л. Талстога (Нехлюдаў), «Чацвёрты» К. Сіманава (Дзік), «Футбол» П. Кантэна і Д. Бэлэзка (Стэнлі Кар).

□

Скончыўшы драматычныя курсы Наркамасветы БССР, Сцяпан Фёдаравіч Хацкевіч у 1932 годзе едзе працаваць у Другі беларускі драматычны тэатр (цяпер Тэатр імя Якуба Коласа). Пачынаючы з верасня 1937 года, Сцяпан Фёдаравіч — артыст Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Большасць роляў, якія выконвае артыст на акадэмічнай сцэне, — эпізадычныя. Але ў кожнай з іх Сцяпан Фёдаравіч умее пільна заўважыць найбольш характэрнае для дадзенай чалавечай індывідуальнасці, напоўніць аўтарскі тэкст глыбінёй пачуццяў. Таму кожны яго персанаж — сапраўдны мастацкі вобраз: ці гэта рабочы Семяніхін у «Канстанціне Заслонаве» А. Маўзона, ці старшыня калгаса Буйкевіч у «Лявонісе на арбіце» А. Макаёнка, або пан Цюхай-Ліпскі ў «Пінскай шляхце» Дуніна-Марцінкевіча.

З апошніх работ С. Хацкевіча найбольш уражлівыя — Банар у драме К. Сіманава «Чацвёрты», слуга Доктара ў «Забытым усімі» Н. Хікмета.

□

Заслужаны артыст БССР Віктар Максімавіч Чарнабаеў — адзін з лепшых выканаўцаў басовых партый у нашым Тэатры оперы і балета. У мінулым удзельнік мастацкай самадзейнасці, саліст ансамбля песні і танца Маскоўскай ваеннай акругі В. Чарнабаеў, пастаянна ўдасканальваючы сваё вакальнае майстэрства, змог стаць вядучым оперным артыстам. Створаныя ім у нашым тэатры яркія, выразныя вобразы Мельніка («Русалка»), Мефістофеля («Фауст»), Малюты Скуратава («Царская нявеста»), Мендозы («Заручыны ў манастыры») і іншыя — атрымалі агульнае прызнанне шырокай грамадскасці.

Г. Б. Шчарбакоў.

Т. І. Шымко.



А. Л. Андрэеў.

І. С. Абраміс.

М. Ул. Адамейка.

Р. В. Дзідзенка.

В. П. Тарасаў.

С. Ф. Хацкевіч.

В. М. Чарнабаеў.

У НОВЫ ДЗЕНЬ, У НОВЫ СВЕТ...

Тут будзе горад Светлагорск...

Горад, праўда, ужо ёсць, толькі планіроўка яго цэнтра пакуль што не закончылася. І вось вы бачыце, як два архітэктары, Генадзь Булдаў і Юлій Глінка, схіліліся над адным з варыянтаў праекта...

Светлы ён будзе, яшчэ адзін наш горад, светлы і ўтульны. Як вясна, як май, як сама яго цудоўная паэтычная назва — Светлагорск. І на яго вуліцах калі-небудзь таксама ўладкуецца з мальбертам мастак, будуць шукаць да яго назвы свае рыфмы паэты, і будуць спяваць на яго дварах нашы дзеці самыя папулярныя песні шасцідзесятых гадоў. Песні пра сцяжынкі далёкіх планет і пра тое самае сонца, якому па загаду дзіцяці належыць быць заўсёды, як заўсёды ў сваю пару прыходзяць на зямлю вясна і май.

Прыходзяць, каб ісці разам з намі ў новы дзень, у новы свет.

ЯРАСЛАЎ ГАШАК ЗМАГАЕЦЦА

Калі савецкая ракета з Лайкаю на борце паляцела ў космас, газета «Рудэ права» — цэнтральны орган кампартыі Чэхаславакіі змясціла карыкатуру «Швейк у Амерыцы». Дастаючы з карабка запалак малюсенькага сабачку, Швейк гаворыць амерыканскаму прафесару: «Ваша правасхадзіцельства, мне пашанцавала вывесці пса для вашых спадарожнікаў».

У героя сатырычнай эпапеі Яраслава Гашака — незвычайны лёс. З гадамі папулярнасць яго не толькі не змяншаецца, а, наадварот, усё больш расце. Швейк змагаўся супраць Аўстра-Венгерскай імперыі, але калі гітлераўскія полчышчы захапілі Чэхаславакію, ён зноў апынуўся ў баявым страі. У гады Вялікай Айчыннай вайны нашы франтавыя газеты друкавалі «Новыя прыгоды бравага салдата Швейка». А цяпер Швейк смяецца з няўдач амерыканскіх прафесараў з мыса Канаверал...

Браваму салдату суджана доўгае жыццё. Ды гэта нікога не дзівіць, калі прыгадаць, якімі рысамі надзяліў свайго героя аўтар. Швейк — увасабленне цвярозага сэнсу і невычэрпнага аптымізму народа, яго бадзёрасці і волі да барацьбы. Смех Швейка—смех чалавека, глыбока перакананага ў справядлівасці сваёй справы, у абавязковай яе перамозе. Гэта смех пераможцы.

Вобраз Швейка праходзіць у рамане складаную эвалюцыю. У гэтым сэнсе мы можам параўноўваць героя і аўтара. Як вядома, самому Гашаку таксама давялося прайсці вялікі і складаны шлях.

Ён нарадзіўся ў 1883 годзе ў Празе ў сям'і настаўніка. Рана застаўшыся без бацькі, Я. Гашак ідзе «ў людзі». Але потым ён зноў атрымлівае магчымасць вучыцца і канчае камерцыйнае вучылішча. Будучага пісьменніка, аднак, не цікавіць кар'ера чыноўніка. Ён ірвецца з затхлага мяшчанскага асяроддзя, у якім вырас. Я. Гашак атрымлівае месца ў банку, але неўзабаве кідае службу і пачынае падарожнічаць. Пешшу, без капейкі ў кішэні, пісьменнік абышоў усю Аўстра-Венгерскую імперыю. Тут ён сустрэў герояў першых сваіх апавяданняў.

Супярэчнасці, якія панавалі ў Аўстра-Венгрыі, вельмі востра адчуваліся на радзіме Я. Гашака—у Чэхіі. Яна раней за іншыя вобласці феадальна-памешчыцкай імперыі ступіла на шлях капіталістычнага развіцця. Капіталізм яшчэ мацней павялічыў тут нацыянальны прыгнёт, сарваў ідылічныя заслоны з рэштак патрыярхальных адносін. Капітал адкрыта ўсталёўваў сваю мараль сквапнасці і нажывы.

Я. Гашак праўдзіва паказаў змены ў горадзе і вёсцы. Яго сімпатыі на баку «маленькіх людзей», якіх бязлітасна перамолваюць капіталістычныя жорны. Але як памагчы сваім героям, Я. Гашак не ведае. Ён не бачыць рэальных шляхоў вызвалення радзімы.

З прычыны асаблівых гістарычных умоў сярод некаторай часткі чэшскай інтэлігенцыі быў распаўсюджаны анархізм. Трапіў пад уплыў гэтай плыні і Я. Гашак. Ён прапаведуе анархісцкія ідэі на рудніках, рэдагуе анархісцкую газету. Спатрэбіўся час, каб пісьменнік вызваліўся ад сваіх памылковых перакананняў.

У 1915 годзе Я. Гашака біруць у салдаты і адпраўляюць на рускі фронт. Ваяваць за інтарэсы манархіі Габсбургаў, праліваць кроў рускіх братоў чэхі і славакі не хацелі. Цэлымі палкамі здаваліся яны ў палон. Пры першым жа зручным выпадку зрабіў гэта і Я. Гашак.

У Расіі фарміраваліся часці (легіёны) з чэхаў і славакаў, якія царскі ўрад меў намер выкарыстаць у барацьбе супраць Аўстра-Венгрыі і Германіі. Я. Гашак спадзяваўся, што рускі цар прынясе свабоду яго радзіме. Ён актыўна ўдзельнічаў у вярбоўцы добраахвотнікаў для легіёнаў. Варожа сустрэў спачатку пісьменнік заклік бальшавікоў: «Далоў вайну!»

Толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў пісьменніка звалілася заслона з вачэй. «Прамені вызвалення ўсяго свету і нашага народа зыходзяць ад Рэспублікі Саветаў», — напіша ён пяць месяцаў пазней у звароце да суайчыннікаў.

Немцы наступаюць на Украіну. Контррэвалюцыйнае кіраўніцтва легіёнаў не хоча памагчы маладой рэспубліцы Саветаў. Па ўказцы Антанты яно рыхтуецца павесці свае часці ў Францыю. Я. Гашак абвяшчае, што не згодзен з такім рашэннем. Ён выходзіць з чэшскага войска і заклікае таварышаў пераходзіць на бок рэвалюцыі.

Калі эшалоны легіянераў пачынаюць накіроўвацца да далёкаўсходніх портаў, Я. Гашак едзе ў Маскву, туды, дзе сабраліся рэвалюцыйна настроеныя чэхі і славакі. Яны ствараюць чэхаславацкую секцыю Расійскай камуністычнай партыі і пачынаюць выдаваць сваю газету. У першым нумары паяўляецца артыкул Я. Гашака.

Рэвалюцыя абудзіла ў пісьменніка талент прапагандыста і агітатара. Ён імкнецца ў самую гушчу падзей.

Партыя накіроўвае Я. Гашака ў Самару, праз якую едуць на ўсход чэхаславацкія воінскія часці. Ён выступае з прамовамі на вакзале, піша лістоўкі, разам з таварышамі фарміруе інтэрнацыянальнае падраздзяленне, якое павінна ўвайсці ў склад Чырвонай Арміі.

Пачаўся чэхаславацкі мяцеж. Я. Гашак стаў сведкам раз'юшанага белагвардзейскага тэрору, убачыў сапраўднае аблічча ворага. Ён прайшоў такую школу класавай барацьбы, якую ў іншы час не мог прайсці за доўгія гады.

Лінію фронту Я. Гашак перайшоў ля Сімбірска. Ён трапіў у 5 армію, адно з самых лепшых злучэнняў маладой Чырвонай Арміі. Касцяк камандна-палітычных кадраў складалі тут піцерскія бальшавікі. Многія з іх сталі блізкімі сябрамі пісьменніка.

Разам з 5 арміяй Я. Гашак прайшоў вялікі шлях ад Уфы да Іркуцка. Два гады, праведзеныя на пярэднім краі барацьбы за Уладу Саветаў, адыгралі рашаючую ролю ў жыцці пісьменніка. Яны тлумачаць нам небывалы творчы ўзлёт наступных двух гадоў, які завяршыўся стварэннем «Прыгод бравага салдата Швейка».

Я. Гашак спачатку працуе памочнікам каменданта Бугульмы, потым начальнікам друкарні і супрацоўнікам чырвонаармейскай газеты «Наш путь».

У Расіі Я. Гашак пачаў пісаць па-руску. Мова яго рускіх фельетонаў і артыкулаў здзіўляе нас сваёй сакавітасцю, выразнасцю.

Рэвалюцыйна-ваенны савет дае Я. Гашаку ўсё больш адказныя даручэнні. Пісьменнік кіруе работай з замежнымі грамадзянамі ў 5 арміі і з ваеннапалоннымі па ўсёй тэрыторыі Сібіры. Ён выбіраецца сакратаром райкома штаба арміі, часта выступае на мітынгах і сходах, вучыць і вучыцца ў мас.

Будучы аўтар «Бравага салдата Швейка» прайшоў у Расіі пад кіраўніцтвам рускіх таварышаў-камуністаў сапраўдны універсітэт марксізма-ленінізма, і мы можам з упэўненасцю сказаць: калі б не было гэтага універсітэта, не было б і рамана пра Швейка.

У снежні 1920 года Я. Гашак па хадайніцтву чэхаславацкіх партыйных органаў едзе на радзіму.

Захаваліся ўспаміны, у якіх сцвярджаецца, што пісьменнік ужо ў Расіі абдумваў будучую сваю эпапею. Супраць гэтага цяжка штонебудзь запярэчыць, але бясспрэчна і тое, што задума рамана канчаткова выспела пазней.

Твор нарадзіўся ў выніку сутычкі Гашака з буржуазнай рэчаіснасцю. Апынуўшыся на радзіме, пісьменнік вельмі хутка пераканаўся, што парадкі ў буржуазнай рэспубліцы Чэхаславакіі мала чым адрозніваюцца ад парадкаў манархічнай Аўстра-Венгрыі. Выкрыццё паліцэйска-жандарскай буржуазнай дзяржавы, усіх яе інстытутаў па-ранейшаму заставалася адной з самых актуальных задач. І пісьменнік бліскуча справіўся з ёй, хоць і перанёс дзеянне рамана ў дзяржаву, якая знікла з карты Еўропы ў выніку вайны.

Часткай агульнай задумы Гашака з'явілася і «заніжэнне» вобраза галоўнага героя. Дрэнныя справы ў паноў, павінен усклікнуць чытач, калі нават скрупулёзнае выкананне іх загадаў не дае жаданых вынікаў. Але чым больш задумваешся над прастадушнасцю Швейка, тым больш пераконваешся, што прастата яго толькі знешняя. У недарэчным становішчы кожны раз апыняецца не «ідыёт» Швейк, а яго начальнікі. Мы смяёмся з іх, смяёмся разам са Швейкам, а яшчэ больш дзякуючы яму. У гэтым вельмі важная асаблівасць твора.

Вобраз Швейка, як ужо гаварылася, праходзіць у рамане сур'ёзную эвалюцыю. Ён зусім не такі ў апошняй частцы, якім быў у пачатку. Пра гэта добра сказаў Юліус Фучык. «Швейк, — пісаў ён,—гэта тып чэшскага маленькага чалавека. У яго няма сур'ёзнага палітычнага вопыту, ён не прайшоў выхаваўчай школы заводскай працы... Яго «швейкаўшчына» — гэта ў пачатку самаахова супраць лютасці імперыялізму. Але хутка абарона перарастае ў напад. Сваёй пародыяй на паслушэнства, сваім простанародным жартам Швейк падрывае з такой цяжкасцю ствараемую рэакцыянерамі сілу іх улады, ён, як чарвяк, точыць рэакцыйны лад і зусім актыўна—хоць не заўсёды зусім свядома—памагае ламаць будынак прыгнёту і самавольства».

Чалавекам без сур'ёзнага палітычнага вопыту, які не прайшоў выхаваўчай школы заводскай працы, быў у свой час і Я. Гашак. Але на яго шляху была рэвалюцыйная Расія. Пісьменнік таксама збіраўся правесці свайго героя праз рускі палон, зрабіць яго відавочцам вялікіх рэвалюцыйных баёў. Тут Швейк ужо не мог заставацца такім, якім быў раней... Смерць спыніла працу пісьменніка, але, як адзначыў Фучык, фельетоны і артыкулы, напісаныя Я. Гашакам у Савецкай Расіі і пазней у Чэхаславакіі, даюць нам магчымасць дапоўніць характарыстыку Швейка, убачыць яго такім, якім аўтар уяўляў яго сабе пазней.

Я. Гашак застаецца для нас пісьменнікам-байцом, творы якога памагаюць змагацца з перажыткамі мінулага, сцвярджаць у чалавеку высакародныя якасці і пачуцці.

Яраслаў Гашак з намі ў нашай барацьбе супраць імперыялістаў, за свабоду і шчасце народаў.

М. МАРЦІНКОЎСКІ.

Юрка прымае спадчыну

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

Алка неўзаметку кіўнула галавою: маўляў, прадавай, прадавай за чатыры! Майка таксама кіўнула і як бы здзівілася з матчынай неспрактыкаванасці. Маці лёгенька ўсміхнулася ў адказ — гэтак аднымі вачыма — і сказала, што няхай будзе так, бярыце за чатыры. Старая выняла скамечаную траячку, адлічыла рубель срэбрам і паклала маці на далоню. Траячка была такая скамечаная, быццам яе хто пажаваў і Юрку стала крыўдна за скрыню. Але ён, вядома, нічога не сказаў. Яму не да таго было. Зноў румнулі ў пакой дужыя хлопцы—рыжы і чарнявы,—яны ўвалілі крэсла і стол на спіну і затупацелі па прыступках. А маці прысела ля скрыні і ўзялася выкідваць з яе рознае дабро.

— Ну, хлопчыкі, цягніце канапу і гэтую... як яе,—весела сказала старая.

Яна акінула пакой прагавітым позіркам—што б яшчэ купіць,—але, відаць, не знайшла нічога прыдатнага і, кланяючыся, падалася да дзвярэй.

— Бывайце здаровы, дамачка-прыгажуня! Жадаю вам шчасця на новай кватэры, шчасця і багатага мужыка, калі такія ёсць яшчэ на свеце.

— Донэр-ветэр! Яна папсавала мне ўсе нервы!—вымавіла Алка, калі яны засталіся адны.

— Мадам, віншую! — з прэтэнзіяй на дасціпнасць сказала Майка.

— Хопіць выскаляцца! — мама пералічыла грошы і раптам агледзелася, што старая недадала рубель. Але гэта ёй нават не сапсавала настрою. Рубель урэшце ж не грошы! Вось хутка ёй дадуць кандыдата навук, тады яна зарабляць будзе ўдвая больш. А зараз галоўнае—сабрацца і пераехаць на новую кватэру.

І яны сталі збірацца. Маці прысела каля нажытку, выкінутага са скрыні, і ўзялася перабіраць яго. Тое, што, на яе думку, было яшчэ гожым, яна клала ў чамадан. Астатняе адкідала ўбок, каб, відаць, потым выкінуць. Юрка сачыў за кожным яе рухам. Вось паказаліся фотакарткі. Мама ўзяла прадзеда Міколу Іванавіча, выцерла яго суконачкай, прадзед заблішчаў, як новы, і нават заўсміхаўся.

— Глядзі ты, георгіеўскі кавалер,—сказаў дзядзька Мікола, разглядаючы картку.

Затым ішоў дзед Пятро Мікалаевіч, матрос з карабля, пра які спяваецца ў песні. Ён быў у цяльняшцы і ў бесказырцы з надпісам «Варягъ». Апошнюю літару Юрка не ўмеў чытаць і яна здалася яму лішняй. Потым маці выняла дзядзьку Сымона Пятровіча і другога дзядзьку, Ягора Пятровіча, у вострай шапцы-шлеме, з ордэнам на грудзях. Пра гэтага дзядзьку маці сказала, што з ім здарылася нейкае непаразуменне і што ён памёр нядаўна, гадоў дзесяць назад, недзе ў Сібіры.

Нарэшце, пайшлі татавы карткі. Іх было многа. Пэўне штук дзесяць. Тата маленькі — яму тры гады. Тата—студэнт, поруч з нейкай дзяўчынкай, не падобнай на маці. Тата—салдат, у першы дзень вайны. Тата—лейтэнант з двума кубікамі на пятліцах. Тата—капітан з медалем за адвагу і трыма ордэнамі. На самай апошняй картцы тата ўжо быў падпалкоўнікам. Поруч з ім сядзела маці—вельмі ж прыгожая, і сталі Алка і Майка. Юркі сярод іх не было. Як сказала маці, ён тады яшчэ не нарадзіўся.

— Мама, а дзе жоўты гузік?

— Які гузік?—не зразумела маці.

— Жоўты. Пра... прадзедаў.

— А, той, што гайдук падараваў?—і маці ўзялася шукаць жоўты гузік.

Юрка сядзеў, падабраўшы пад сябе ногі, і не спускаў з яе вока. Вось яна перабрала ўсе транты. А потым пераклала з аднаго месца на другое ордэны і медалі, але гузік нідзе не знаходзіўся. Маці зазірнула пад пісьмовы стол, які вырашылі было пакінуць, бо ён зусім разваліўся, але і там не знайшла. Тады яна зноў ператрусіла транты. Дарма! Жоўты гузік як скрозь зямлю праваліўся.

— Ах, якая страта!—пакпіла Майка. Яе гэты гузік і нават узнагароды ды і сама картка нічым не ўражвалі.

— Вядома, страта! — заступіўся за Юрку дзядзька Мікола.—Гузік гэты не просты. Ён з чыстага бурштыну. Да таго ж гэта сувенір, памяць. А памяць—самае дарагое, што дадзена чалавеку. Трэба гэта разумець! Вось, скажам, папяроснік. — Ён паказаў цэлулоідны папяроснік, зроблены з чырвоных, жоўтых і сініх колцаў. — Для вас усё гэта драбяза, а для мяне ён даражэйшы за дыяменты, бо мне яго падараваў франтавы сябра Хведзька Куперын. Сёння якраз дваццаць год, як фашыст зваліў Хведзьку ў бойцы пад Дзмітраўск-Арлоўскім, гэта на Курскай дузе. Таму і выпіў я трошкі, і гэтым памянуў сябра... Прабачце!—ён узяў у рот пусты папяроснік, патрымаў яго і зноў паклаў у кішэнь.

— Дзяўчаткі, шукайце!—сказала маці.

І ўсе ўзяліся шукаць. Нават дзядзька Мікола.

Юрка таксама пачаў шукаць. Адсунуўшы каробкі і чамаданчыкі, зазірнуў на падаконнік, выкалаціў усё з Алчынага партфеля. Алка зазлавала і пляснула яго па спіне: маўляў, не лезь, куды не трэба! Юрка заплакаў. Не таму заплакаў, што балела,—не, проста было шкада бурштынавы гузік.

— Мама, мама, дзе гузік?!—Юрка размазаў па твары слёзы.

— У скрыні, вунь дзе! — здагадалася Алка.—Гэта тая старая забрала гузік разам са скрыняй.

— Забрала, факт!—падтрымала Майка.

А дзядзька Мікола паскроб патыліцу:

— Магчыма... Усё можа быць,—і не развітаўшыся, пайшоў з пакоя.

Майка, захлынаючыся смехам, сказала, што заўтра яны выклічуць з міліцыі аўчарку і па следу знойдуць старую, якая купіла скрыню. Інакш ніяк яе не знойдзеш. Алка прапанавала зрабіць гэта сёння, адразу, пакуль сляды не прастылі. Праз усю ноч Юрку трызніўся вусаты гайдук, падобны на дзеда Мікалая Іванавіча. Ён то падміргваў малому, то пагражаў пальцам.

А потым яны пераехалі. Адразу на адной машыне.

Юрка ніколі не забудзецца на тую сумятню. Прыйшлі нейкія мужчыны і пачалі цягаць усё, што было ў пакоі, на двор, дзе стаяў грузавік. Маці хвалявалася: як бы чаго не забыцца! Алка з Майкай памагалі грузчыкам. Разы два яны сыходзілі ўніз з лёгкімі клункамі і вярталіся назад. Толькі Юрка не браў удзелу ў пагрузцы. Ён стаяў поруч з мамай і наглядаў, як пусцее стары пакой.

Праводзілі іх амаль усе суседзі. Борка на развітанне падарыў Юрку залатога жука. Такім добрым Юрка яшчэ ні разу яго не бачыў. А калі грузавік крануўся, аднекуль з завулка вырынуў дзівак дзядзька Мікола і замахаў рукамі. Мама нешта крыкнула, грузавік спыніўся, і дзядзька Мікола дагнаў іх на паваротцы.

— Вось знайшоў! Гузік знайшоў! У скрыні быў!—ён працягнуў жоўты гузік і новенькі срэбны рубель, які тады недадала старая.

— Дзякуй, Мікола Іванавіч! — сказала маці.

— Няма за што! — шырока ўсміхнуўся дзядзька.

І Юрка сказаў дзядзьку Міколу дзякуй. А потым узяў у маці жоўты гузік, заціснуў у кулак, а кулак засунуў у кішэню кароткіх штонікаў. Гэтак больш надзейна.

Дзядзька Мікола доўга стаяў на тратуары і махаў рукою, маці таксама махала. Ёй чамусьці было вельмі сумна. Нават на новай кватэры яна не знаходзіла сабе месца. Расставіла мэблю—і старую і новую, якую толькі што купілі ў магазіне, прыбіла да сцяны дыван, параскладала кардонныя карабкі і чамаданчыкі. Юрку далі новую канапу ў вялікім пакоі. І столік-сакрэтэр, каб рыхтаваць урокі, калі пойдзе ў школу. Юрка быў вельмі задаволены. Асабліва ён быў задаволены, што мама дала яму не толькі жоўты гузік, але і ўсе карткі продкаў, у тым ліку і адну татаву картку, на якой ён быў зняты капітанам. І крыжы аддала, і медалі, і нават ордэны.

Узнагароды і карткі Юрка паклаў у сакрэтэр.

— От тут у цябе яны будуць і захоўвацца,—сказала маці.

Маці пашкадавала, што прадала скрыню. У новай кватэры аказаўся закутак у калідоры, дзе яе можна было паставіць. І яна стаяла б тут, нікому не замінаючы. І рэчы ў ёй хаваліся б, як раней, і памяць...

— Ідучы ў будучыню, трэба браць з сабою сёе-тое з мінулага,—колькі разоў паўтарала яна задумліва.—І наогул... Мікалай Іванавіч меў рацыю: памяць—самае дарагое, што дадзена чалавеку! Во як, дзяўчаткі!

Юрка сур'ёзна, не ўсміхаючыся, як сапраўдны мужчына, пазіраў на Алку і Майку.

Пераклад з рускай мовы.

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Лепшы твор Яраслава Гашака «Прыгоды бравага салдата Швейка» вядомы бадай што на ўсіх мерыдыянах і паралелях планеты. Спрытны салдат Швейк стаў увасабленнем барацьбы простага чалавека з коснасцю і руцінай буржуазнай дзяржаўнай машыны, з усялякім тупым салдафонствам. Нездарма рэакцыйныя крытыкі-эстэты ў розных краінах і, у першую чаргу, у Чэхаславакіі Масарыка адразу ж пасля выхаду ў свет «Швейка» пачалі абвінавачваць раман у цынізме і амаральнасці.

Першыя, хто даў правільную і вельмі высокую ацэнку «Швейка», былі камуністы — чытачы і літаратары. «Прыгоды бравага салдата Швейка ў сусветнай вайне — адна з лепшых кніг, калі-небудзь напісаных у Чэхіі»,—так адказваў крытыкам Я. Гашака пісьменнік-камуніст Іван Ольбрахт, адзін з заснавальнікаў чэшскай сацыялістычнай літаратуры.

Юліус Фучык, які назваў кампанію буржуазнай прэсы «вайной са Швейкам», трапна вызначыў і прычыны гэтай вайны: «Усе паняцці буржуазнага свету, яго патрыятызм, яго справядлівасць і мараль — увесь жыццёвы лад— з такой дасканаласцю высмеяны Швейкам, што буржуазнаму грамадству хутчэй павінна быць уласцівая тэндэнцыя валваць супраць яго, чым яго вітаць».

Нам прыемна зазначыць, што такую ж ацэнку і амаль у той жа час, што і Ю. Фучык, далі творчасці Я. Гашака савецкія, і ў прыватнасці, беларускія літаратары. «Савецкая Беларусь» у 1928 годзе падкрэсліла самабытнасць творчасці чэшскага пісьменніка, адсутнасць якіх-небудзь уплываў на яе Марка Твэна або Чарльза Дзікенса, праўдзівасць і пераканаўчасць вобразаў, папулярнасць пісьменніка ў пралетарскіх масах.

Праз тры гады, калі беларускія пісьменнікі Кандрат Крапіва, Кузьма Чорны, Максім Лужанін і Міхась Зарэцкі пачалі пераклад сатырычнай эпапеі Я. Гашака на беларускую мову, часопіс «Чырвоная Беларусь» пісаў, што гэты твор «уяўляе сабой таленавітую і надзвычайна насычаную бытавым матэрыялам сацыяльную сатыру на буржуазны лад, на яго мілітарысцкую і нацыяналістычную палітыку».

Апрача чатырох тамоў «Швейка», на беларускую мову перакладзены апавяданні «Партрэт імператара Франца-Іосіфа», «Таямніца споведзі», «Цвёрдая скура», «Боская ласка», «Хахолка», «Каза і ўсемагутны бог». Урыўкі з «Прыгод Швейка» тройчы выходзілі ў «Бібліятэчцы чырвонаармейца».

Атрымаў Швейк прапіску і ў творах беларускіх пісьменнікаў. Яго з'едлівая насмешка гучала па адрасу гітлераўцаў са старонак ваенных выданняў. Валянцін Зуб не так даўно напісаў гумарыстычнае апавяданне «Швейк у Нью-Йорку».

А. МАЖЭЙКА.

ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ Я. ГАШАКУ

У Беларускім драматычным тэатры імя Янкі Купалы адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння чэшскага пісьменніка Яраслава Гашака. Вечар адкрыў народны пісьменнік БССР Кандрат Крапіва. Ён коратка расказаў аб выдатных творах пісьменніка. З дакладам аб жыцці і грамадскай дзейнасці Яраслава Гашака выступіў М. Скрыпка. Намеснік старшыні Беларускага таварыства культурных сувязей з зарубежнымі краінамі В. Чарняўская прачытала прывітальную тэлеграму таварыства сяброў Яраслава Гашака. Апавяданне Я. Гашака «Біяграфія амерыканца» прачытаў артыст Тэатра імя Я. Купалы Р. Філіпаў. У вестыбюлі тэатра экспанавалася выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці вядомага чэшскага сатырыка.

С. ДУБЯЛІР.

Наступны нумар газеты выйдзе 4 мая.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-22-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 10219